Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּרעלעטאריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК
22 лютага 1932 г.
№ 42 (3431)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ.—Да 1-га сакавіка закончыць лёнагазатоўкі
Сустрэць тарфяны сэзон ва ўсеузброеньні («Правда»).
Н. АСАУЛЯК. Некаторыя вынікі работы сеткі партвучобы у жывёлагадоўчых раёнах БССР.
Партыйнае будаўніцтва (2-ая стар.).
Змагацца за пачэснае месца перадавога раёну (2-ая стар.).
Лясная астафэта (3-яя стар.).
Поўнасьцю ахапіць вучобай ўсіх няпісьменных (3-ая стар.).
Бібліяграфія (3-яя стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ (1-ая стар.).
ПА БССР (4-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ

МАСАВЫ РАССТРЭЛ СЯЛЯН У ЗАКАРПАЦКАЙ УКРАІНЕ

Бурныя дэманстрацыі пратэсту ва ўсіх гарадох Чэхаславакіі

ПРАГА. 20.II. Насьля галодных дэманстрацый ў часе чырвонага дню 10 лютага, які прайшоў на Закарпацкай Украіне асабліва бурна, там фактычна панує асадное становішча. 18 лютага ў вёсцы Туёня—Пасіка зьнішчыў жандармскі патруль, які арыштаваў некалькі сялян за ўдзел у дэманстрацыях 10 лютага. Жыхары вёскі ўдарылі ў набат. Звыш 300 беднякоў і рабочых сабраліся і вызвалілі арыштаваных. Увечары прыбылі падмацаваньні. Сяляне, аднак, трымаліся моцна. Жандары адкрылі агонь па сялянах. 18-ці гадовы сельскі рабочы забіт, беднякі Дакуліч і Кароль цяжка паранены. Апрача таго, паранены 12 жыхароў і 4 жандармы.

Цяпер вёска зараз перапоўнена жандарамі. Усе насельніцтва вёскі паўцякала ў акалічныя лясы. Арыштаваныя жандарамі сяляне адвозяцца ў вёйцавах у Вушгарад. Арыштавана 24 сяляніна. Падобная-ж сутычка адбылася ў вёсцы Сімэрка ў тым-жа раёне. У сувязі з гэтымі расстрэламі ўчора ў горадзе Брыо (Маравія) адбылася дэманстрацыя пратэсту тысячы рабочых. Паліцыя разагнала дэманстрацыю, арыштаваўшы 10 рабочых, сярод іх камуністычнага дэпутата Юрана.

У Празе і іншых гарадох Чэхаславакіі таксама адбыліся дэманстрацыі пратэсту. Камуністычная парляманцкая фракцыя ўнесла тэрміновую прапанову аб неадкладным скліканьні парляманту, патрабуючы тлумачэньня ад ураду. Фракцыя рашыла накіраваць у Закарпацкую Украіну спэцыяльную камісію.

„Новы" габінэт у Францыі

ФРАНЦУСКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМ ВЫЗНАЧЫЎ НОВЫХ ПРЫКАЗЧЫКАЎ, ДЛЯ БОЛЬШ ШПАРКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЗБРОЙНАГА НАПАДУ НА СССР, ДЛЯ ПРЫДУШЭНЬНЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ ЯК У САМОЙ ФРАНЦЫІ, ТАК І АСАБЛІВА Ў КАЛЕНІЯХ.

ПАРЫЖ. 21.II. Новы французкі габінэт сфармаваны ў наступным складзе:

Прэм'ер і міністр замежных спраў —Тард'е (быў вайсковым міністрам у мінулым габінэце Лаваля).

Дэпутат групы «левых рэспубліканцаў»—міністр юстыцыі — Рэймо (быў міністрам калёній у мінулым габінэце, дэпутат групы «дэмакратычнага і сацыялістычнага дзеяньня»).

Міністр унутраных спраў—Мацье (дэпутат групы «рэспубліканскага дэмакратычнага саюзу»).

Міністр фінансаў—Фляндэн (займаў той-жа пост у мінулым габінэце, дэпутат групы «левых рэспубліканцаў»).

Міністр нацыянальнай абароны П'етры (быў міністрам бюджэту ў мінулым габінэце, дэпутат групы «левых рэспубліканцаў»).

Міністр асьветы—Рустан займаў той-жа пост у мінулым габінэце, выключаны з сацыялістычнай партыі.

Міністр пэнсій і вызваленых вобласьцей—Шамнецье Дэ-Рыб (быў міністрам пэнсій ў мінулым габінэце, дэпутат групы «народных дэмакратаў»).

Міністр працы — Лаваль (былы прэм'ер і міністр замежных спраў сэнатар, не далучаецца ні да якай групы ў сэнаце).

Міністр аховы здароўя — Блезо (займаў той-жа пост у мінулым габінэце, дэпутат групы «рэспубліканскага дэмакратычнага саюзу»).

Міністр грамадзкіх работ,—зносін і тэлеграфу—Гарнье (быў міністрам пошты і тэлеграфу ў мінулым габінэце, дэпутат групы—«радыкальна левай»).

Міністр земляробства—Шаво (сэнатар групы «рэспубліканскага саюзу»).

Міністр гандлю, а таксама пошты і тэлеграфу—Рален, (быў міністрам гандлю ў мінулым габінэце, дэпутат групы левых рэспубліканцаў).

Міністр калёній—Шандэле быў міністрам гандлёвага флёту ў мінулым габінэце, дэпутат групы—«радыкальна левай»).

Пад гул артылерыйскай кананады

ТОКІЁ. 20-II. Агенцтва Сімбун Рэн га паведамляе, што японскае войска а 7 з паловай гадзін раніцы пачало ўсеагульны наступ на кітайскае войска. Японскае войска заняло горад Цзяньвань (паміж Усунам і Чапэем) і працоўжвае прасоўвацца наперад. Праз гадзіну пасьля пачатку ваенных дзеянь кітайскае войска, што знаходзілася пазіцыі ў Янвапа, пачало адступленьне ў напрамку на паўночны вагзал. Японскае войска заняло імедром.

Напярэдадні падачы ультыматуму японская вайсковая ўлада ў Шанхаі і Токіё заяўляе, што японскае войска нават у выпадку пачатку ваенных дзеянь ня будзе праследаваць кітайскае войска за межамі 20 кілёмэтравай зоны.

***

ШАНХАЙ. 20-II. У Усуне пачаўся бой. На Чапэйскім фронце спакойна.

ШАНХАЙ. 20-II. Значная партыя японскіх маракоў высадзілася ў Хайчжоў (стратэгічны пункт правінцыі Цэнсу).

АБ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ПЛЯНУ НА 1932 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б

Папулярызацыя народна-гаспадарчага пляну БССР на 1932 год сярод шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас гораду і вёскі па вінна праводзіцца шляхам арганізацыі мас вакол практычнай рэалізацыі колькасных і якасных паказьнікаў вызначаных плянам на 1932 г.

Кожны рабочы і работніца, калгасьнік і калгасьніца, бедняк і серадняк-аднаасобнік павінен быць азнаёмлены з плянам на 1932 г., які зьяўляецца перададнем другой пяцігодкі. Кожны рабочы і працоўны сацыялістычнай краіны павінен ведаць, што выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 г. зьяўляецца фактарам яшчэ большага ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту і абароназдольнасьці СССР.

Для правядзеньня масавай работы вакол кантрольных лічбаў на 1932 г. ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Кантрольныя лічбы ў гарадох і раёнах павінны быць даведзены да мас ня толькі ў разрэзе раёну, але і ў разрэзе данага прадпрыемства і лічбы неабходна прапрацаваць у кожным цэху, брыгадзе, зьмене.

2. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі у цэхах, зьменах і брыгадах, кожны камуніст і камсамолец павінны ўзначаліць творчы ўздым мас і шляхам перабудовы работы на аснове шасьці ўмоў т. Сталіна пашырыць практыку стварэньня новых гаспадарча-разьліковых брыгад, дапамагчы практычнай рэалізацыі каштоўных прапаноў і вынаходзтваў рабочых і ўцягнуць у сацыялістычнае спаборніцтва новыя сотні тысяч працоўных.

Прапанаваць ЦСПСБ даць паказаньні профсаветам і ФЗМК аб шырокай прапрацоўцы кантрольных лічбаў па БССР на 1932 г. у цэхах, брыгадах, зьменах і ва ўстановах.

3. У час прапрацоўкі кантрольных лічбаў, кожны цэх, зьмена, брыгада павінны праверыць праграму сваёй работы на 1932 г. і канкрэтна ўлічваючы асаблівасьці вытворчасьці распрацаваць практычныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна ў рабоце данай адзінкі.

Прыкладам такой работы зьяўляецца праверка, праведзеная ленінградзкім заводам «Сьветлана» (заключнае слова т. Арджанікідзе на XVII партканфэрэнцыі).

4. Як пры растлумачэньні ўсяго народна-гаспадарчага пляну на 1932 г., так і пры высоўваньні сустрэчных плянаў галоўную ўвагу сканцэнтраваць на выкананьні колькасных і асабліва якасных паказьнікаў—зьніжэньне сабекошту, падвышэньне вытворчасьці працы, нормы выпрацоўкі і г. д. Прыкладнымі ў высоўваньні сустрэчных плянаў павінны быць гаспадарча-разьліковыя і зьменна-сустрэчныя брыгады, якія лепшы вопыт сваёй работы павінны перадаць больш слабым і нанова арганізаваным брыгадам.

5. Прапанаваць ЦСПСБ, ВСНГ і НКСнабу забясьпечыць на мясцох увязку прапрацоўкі кантрольных лічбаў з правядзімай калдагаворнай кампаніяй і праверкай выкананьня прамфінпляну за студзень і першую дэкаду лютага.

6. Кантрольныя лічбы прапрацаваць ва ўсёй сыстэме партыйнай і камсамольскай асьветы, накіроўваючы ўвагу слухачоў на практычнае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, вызначаных у народна-гаспадарчым пляне.

Культпропу ЦК КП(б)Б у 5-ці дзённы тэрмін забясьпечыць мэтадычнымі ўказаньнямі і дапаможнікамі прапрацоўку кантрольных лічбаў як у сетцы парт-камсамольскай вучобы і нарасьветы, гэтак і для масавай работы ў цэхох, зьменах і брыгадах.

7. У саўгасах, МТС і калгасах прапрацоўку кантрольных лічбаў шчыльна зьвязаць з падрыхтоўкай да вясновай сяўбы.

8. Друк у справе шырокай папулярызацыі народна-гаспадарчага пляну павінен арганізаваць рабочыя і калгасныя масы. Прапанаваць цэнтральнаму, раённаму і нізавому друку сыстэматычнага асьвятляць ход прапрацоўкі кантрольных лічбаў, масавую работу вакол гэтага пытаньня на фабрыках, заводах, саўгасах і калгасах, перадаваць вопыт лепшай масавай работы на больш слабыя яе вучасткі.

9. Прапрацоўка кантрольных лічбаў з жаночымі масамі працоўных, асабліва з жаночым актывам набывае вялікае значэньне. Прапанаваць ГК і РК КП(б) забясьпечыць прапрацоўку кантрольных лічбаў на дзелегацкіх сходах, на гарнфэрэнцыях работніц, на зьлётах ударніц саўгасаў і калгасаў.

Да 1 сакавіка закончыць лёназагатоўкі

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі ўжо ў мінулую веснавую пасеўную кампанію стварыла ўсе ўмовы ў некалькі разоў павялічыць пасеўплошчу тэхкультур, гэтых найважнейшых культур сельскай гаспадаркі ва ўмовах БССР. Высунуты партыйны баявы лёзунг—барацьба за тэхкультуры, стаў адным з папулярных вытворчых лёзунгаў сярод калгаснага сялянства, асабліва лёнаводных раёнаў.

У выніку бальшавіцкага правядзеньня веснавой сяўбы 1931 год стаў годам стварэньня буйных спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў з палямі ў сотні і тысячы га засеву лёну і канапель.

Гэтыя зрухі ў экстэнсіўным разьвіцьці вёскі дасягнуты ў выніку правільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, у упорымірымай барацьбе з кулаком і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі.

Аднак, буйнейшыя зрухі і пашырэньне тэхкультур выражаныя ў колькасных паказьніках без узьняцьця на адпаведны ўзровень якасьці гэтай прадукцыі, сваячасовай яе апрацоўкі і загатоўкі ня могуць задаволіць шпаркі рост сацыялістычнай прамысловасьці. Мы дабіліся колькасьці, але мы не паможылі гэтую колькасьць на тэмпы і якасьць усёй работы, пачынаючы ад засеву, уборкі, апрацоўкі і канчаючы апошнім завяршаючым працэсам—загатоўкамі.

Разрыў паміж засевам — уборкай і апрацоўкай — загатоўкай лішні раз сьцьвярджае аб няўменьні раду нізавых зьвеньняў спалучаць этапы барацьбы за лён. Гэты разрыў адчуваецца асабліва зараз, калі мы ўплатную падыйшлі да тэрмінаў завяршэньня загатовак.

Загатоўкі зьяўляюцца апошнім рашаючым этапам барацьбы за тэхкультуры. Таму паслабленьне тэмпаў барацьбы за лён на гэтым важнейшым этапе неданушчальна. Зусім зразумела, што справа заключаецца ня толькі ў тым, каб пасеять і ўбраць. Справа ў тым, каб убраўшы апрацаваць і сваячасова здаць (прадаць) дзяржаве ўсю тавараную прадукцыю. Што значыць апрацаваць і здаць сваячасова? Гэта значыць расчысьціць шлях для новага ўспраізводзтва, прыступіць да падрыхтоўкі новага чарговага засеву. Трэба цьвёрда памятаць, што сваячасовае выкананьне плянаў загатовак прадрашае сваячасовае пераключэньне ўсёй работы па падрыхтоўцы да сяўбы на сапраўды баявыя тэмпы.

Між тым даныя ходу лёназагатовак па рэспубліцы на 15-га лютага не гарантуюць пасьпяховага выкананьня пляну пры ўмове, калі ня будуць удзе сняроны тэмпы ўсёй работы. Крывая загатовак за трэцюю пяцідзённку лютага ўзьнята толькі на 0,6 проц. (54,1 проц. на 10-га лютага і 54,7 проц. на 16 лютага). Гэтыя лічбы гавораць аб недапушчальным паслабленьні барацьбы за тэхкультуры на рашаючым этапе. Сацыялістычнае плянаваньне патрабуе чоткай рэгляментаванай работы ў суровым спалучэньні з агульным рухам сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Самацёк, «чарга ваньне кампаній» — ідзія са шкодніцкіх відаў праяў апартунізму.

Спробам запягнуць загатоўкі павінен быць дадзены рашучы адпор.

ЦК КП(б)Б, надаючы асаблівае значэньне сваячасоваму выкананьню пляну загатовак, устанавіў цьвёрды тэрмін — да 1-га сакавіка завяршыць лёназагатоўкі. Гэты тэрмін зьяўляецца канчатковым. Ніякіх адтэрміновак. Трэба адмесьці ўсякія апартуністычныя разважаньні аб немагчымасьці на даным адрэзку часу завяршэньня лёназагатовак. Даны плян загатовак упаўне рэальны. На прыкладах барацьбы за лён саўгасаў, на прыкладах датэрміновага выкананьня плянаў радам перадавых раёнаў мы ўправе сьцьвярджаць, што маем усе магчымасьці для таго, каб з посьпехам ня толькі выканаць, але і перавыканаць кантрольныя лічбы. Для гэтага патрабуецца чоткая бальшавіцкая работа, штодзённы кантроль і апэрацыйнае кіраўніцтва ўсёй загатоўчай работай, рашучая барацьба з апартуністычным самацёкам.

Рашаючай умовай пасьпяховага завяршэньня зьяўляецца правільная арганізацыя першапачатковай апрацоўкі. Той факт, што на сёньняшні дзень шмат ільняной саломы яшчэ не апрацавана гаворыць аб яўнай недаацэнцы радам калгасаў і МТС гэтай справы. МТС, якія паказалі прыклады бальшавіцкай работы на збожжазагатоўчым фронце, не перанесьлі гэтых прыкладаў на лёназагатоўкі, не рэалізавалі дырэктыў НКЗ і Калгасцэнтру аб арганізацыі першапачатковай апрацоўкі.

Барацьба за лёнаазалакно, за якасьць апрацоўкі павінна заняць цэнтральнае месца ў рабоце МТС. МТС абавязаны ў бліжэйшыя дні круга ўзьняць уверх крывую лёназагатовак, узначаліць бальшавіцкую барацьбу за лён і ў першую чаргу дабіцца завяршэньня загатовак у абслугоўваемых калгасах.

Мы ня раз завастралі ўвагу аб недапушчальным паслабленьні загатовак у аднаасобным сэктары. Аб чым гавораць лічбы ходу загатовак у сэктарыяльным разрэзе? Саўгасы выканалі плян на 113 проц., калгасы — 70 проц., аднаасобнікі толькі 38 проц. Адставаньне аднаасобнага сэктару тлумачыцца недаацэнкай у радзе месц важнасьці разгортваньня арганізацыйна-масавай работы сярод бядняцка - серадняцкіх мас аднаасобнікаў, адсутнасьцю рашучага націску на кулацка-заможныя элемэнты.

Асабліва павінна быць пасілена наступленьне на кулацтва ва ўзяцьці таварных лішкаў па цьвёрдых заданьнях. Прадукцыя кулацкіх гаспадарак, як правіла, здаецца ў парадку цьвёрдых заданьняў. Тэрміны выкананьня цьвёрдых заданьняў прайшлі, між тым куланкія гаспадаркі гэтых заданьняў яшчэ ня выканалі поўнасьцю. Шалёна супраціўляючыся сацыялістычнаму наступу, кулацтва імкнецца сарваць нашу пяховае выкананьне лёназагатовак. Клясавы вораг вядзе шалёную агітацыю за разбазараньне лёну, за зьніжэньне якасьці здаваемай прадукцыі. У сваёй дзейнасьці кулацтва выкарыстоўвае самацёк і адсутнасьць кантролю за ходам загатовак, асабліва за выкананьнем цьвёрдых заданьняў.

Даючы рашучы адпор кулацкаму супраціўленьню, раённыя арганізацыі на вінны разам з гэтым узмацніць барацьбу з самацёкам, забясьпечыць ход загатовак штодзённым апэрацыйным кіраўніцтвам, мабілізаваць масы.

Мы ўплатную падыйшлі да рашаючага этапу барацьбы за лён. Завяршэньне пляну лёназагатовак зьяўляецца важнейшай гаспадарча - палітычнай задачай. Трэба прыняць усе меры да таго, каб у бліжэйшыя дні скончыць загатоўкі і тым самым стварыць умовы пасьпяховай падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы. Вопыт барацьбы за лён перадавых раёнаў паказаў, што мы маем усе магчымасьці пераможна завяршыць гэту кампанію. Асноўныя шляхі гэтых перамог ляжаць па лініі ўпартай барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, рашучай барацьбы з праявамі апартуністу, з самацёкам, кулацка - рваўкімі тэндэнцыямі ўнутры калгасаў, па лініі самага жорсткага націску на кулацкія элемэнты, па лініі разгортваньня арганізацыйна - масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкіх мас аднаасобнікаў.

Прадукцыя тэхкультур сёлетняй загатоўчай кампаніі зьяўляецца адным з важнейшых элемэнтаў барацьбы за выкананьне народна - гаспадарчага пляну чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі. Барацьба за лён, за пасьпяховае завяршэньне загатовак—ёсьць барацьба за выкананьне пляну завяршаючага году пяцігодкі. Прыйсьці з перамогамі да першага сакавіка па фронце лёназагатовак—баявая задача для кожнага раёну, кожнай партарганізацыі, сельсавету, саўгасу, МТС і калгасу.

Шыбеніцамі, расстрэламі не ўдасца фашыстам стрымаць надыход пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы

Рабочыя, сяляне, працоўная інтэлігенцыя Заходняй Беларусі!

Пятую гадавіну са дню разгрому Грамады сустракае Заходняя Беларусь у жорсткай барацьбе з акупацыяй уладай польскіх паноў і капіталістаў, якіх падтрымоўвае ППС, Стронніцтва Хлопскае, беларускія нацыянал-фашысты, як Лучкевічы, Астроўскія, Акінчыцы, Ярэмічы і інш. Да ўзмацненьня гэтае барацьбы заклікаюцца працоўныя масы былымі паслямі Грамады Тарашкевічам і Валошыным, якія гібеюць ужо доўгія гады ў турмах панскай Польшчы.

Іх баявы, магутны заклік хоць зьняволеных фізічна, але вольных духам, барацьбітоў паказвае шлях для працоўных мас, як скінуць кайданы польскай панскай акупацыі, як вызваліцца з ярма эксплёатацыі, абшарнікаў і акупантаў.

Мы, былыя паслы Грамады, якія вырваліся з рук фашыстоўскіх катаў і працуем у вольнай краіне Саветаў, далучаемся да заклику т.т. Тарашкевіча і Валошына і словамі гэтых барацьбітоў - герояў зьвяртаемся да працоўных мас Заходняй Беларусі:

«Няхай вашая штодзённая барацьба дакажа, што чырвоны сьцяг Грамады ня выбіты з рук працоўных мас, што жыве і магутнее справа вызваленьня беларускага народу з пад панска - польскай акупацыі.

Наперад грамадаўцы! У першыя шэрагі змагаючыхся працоўных мас. Няхай баявы сьцяг Грамады разьвяваюцца ў клясавых баёх, якія разгараюцца па ўсёй Польшчы ва ўсё большае полымя нянавісьці, адвагі і помсты. Наша перамога набліжаецца, наша перамога немінуча».

Сябры грамадаўцы!

Здрадніцы беларускага народу Акінчыцы, Лучкевічы і іншая панская сволач хочуць давесьці вам, што мы кінулі краіну, што мы не змагаліся да канца за справу рабочых і працоўнага сялянства. Яны гэтым хочуць апраўдаць свае прыслужваньне абшарнікам і акупантам, скрыць сваю ролю дэфэнзывнічыкаў у справе здрады інтарэсаў беларускага працоўнага народу.

Фашыстоўскі ўрад выпускаючы нас з астрогу стараўся дэзарганізаваць працоўныя масы, стараўся зламаць нашу рэвалюцыйную волю і ўцягнуць нас у згоду і супрацоўніцтва з акупантамі так як гэта зрабіў Акінчыц. Але гэта ўраду не ўдалася. Па выхадзе з турмы мы зараз - жа прыступілі да рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялян. За гэта нас, як і Тарашкевіча, урад капіталістаў і абшарнікаў хацеў кінуць зноў за краты. Мы змушаны былі пакінуць край і пераехаць у вольную Савецкую Беларусь. Але гэтым мы не адарваліся ад барацьбы рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Бо жывем вашымі думкамі, бо сочым і салідарызуемся з геройчнай барацьбой рабочых і сялян. Мы, працуючы тут і ўкладваючы свае цаглінкі ў вялізарнае сацыялістычнае будаўніцтва, адначасова дапамагаем вашай барацьбе. Бо дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве ёсьць разам і вашы дасягненьні, бо СССР ёсьць бацькаўшчына прыгнечаных народаў усяго сьвету і апора міжнароднага руху рабочых і сялян.

Сябры! Капіталістычная Польшча перажывае руйнуючы крызіс, зачыняюцца заводы і фабрыкі. Новыя і новыя дзесяткі тысяч рабочых выкідваюцца на вуліцу. Галее і ўшчэнт руйнуецца працоўнае сялянства. Урад капіталістаў і абшарнікаў накладвае новыя падаткі, выціскае апошнія сілы з рабочых і сялян, а ўсё гэта ідзе на паліцыю, шпікоў, правакатараў, на падрыхтоўку вайны супроць СССР.

У гэты-жа час у Савецкай Беларусі як і ва ўсім СССР, мы зьяўляемся сьведкамі нябачаных яшчэ ў гісторыі дасягненьняў і пабудовы новага вольнага жыцьця. Беларусь, пры царызьме была самай адсталай краінай, цяпер працоўныя масы пад кіраўніцтвам Кампартыі ператвараюць яе ў краіну прамыслова - калгасную. Новыя заводы, фабрыкі, машына - трактарныя станцыі для сельскай гаспадаркі, рост даб рабыту рабочых і сялян, зьнішчэньне беспрацоўя, падвышэньне культурнага ўзроўню, зьнішчэньне няпісьменнасьці, буйнае разьвіцьцё беларускай пралетарскай культуры — вось заваёвы рабочых і сялян, у руках якіх знаходзіцца ўлада.

Мы ўвачавідку пераканаліся, што толькі Кампартыя змагаецца да канца і аддана за інтарэсы працоўных мас, што толькі пад яе кіраўніцтвам можна перамагчы ў рэвалюцыі і пераможна будаваць сацыялізм.

Посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве наводзяць сьмяротны жах на сусьветную буржуазію, у тым ліку і польскую. Вось таму польскія імпэрыялісты вітаючы напад Японіі на Кітай адначасна точуць зубы супроць Савецкага Саюзу. Японія падбіўшы Манчжурыю, душачы кітайскую рэвалюцыю рыхтуе напад на СССР з Усходу.

У любы момант польскія паны могуць напасьці на Савецкі Саюз з Захаду. Заходняя Беларусь зноў ператворыцца ў край руін, пажараў і ўсіх жудасьцяў вайны.

Рыхтуючыся да вайны ашалелы фашызм ладзіць карныя экспэдыцыі па вёсках Заходняй Беларусі, расстрэльвае дэманстрацыі рабочых і сялян, катуе ў дэфэнзыве лепшых барацьбітоў працоўных мас. Але гэтага мала для азьвярэлага панства. У апошнія часы яны ўвялі ваенна - палявыя суды. Фашыстскі ўрад, урад акупацыі, беспрацоўя і голаду хоча шыбеніцамі затрымаць надыход пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы.

У польскіх фашыстскіх турмах гібеюць паслы Грамады Тарашкевіч і Валошын, гібеюць паслы змаганьня—Гаўрылік, Дварчанін, Валынец і Крынчык, туды - ж кінуты на доўгія гады тысячы і тысячы беларускіх, украінскіх, яўрэйскіх, польскіх рабочых і рэвалюцыйных сялян. У хуткім часе пачнецца яшчэ адзін працэс над правадыром Грамады — Тарашкевічам, каб учыніць яшчэ адну жорсткую расправу над барацьбітом за вызваленьне беларускага народу.

Сябры! Памятайце, што ў гэтай гаўнай, крывавай працы фашызму дапамагаюць ягоныя саюзьнікі і агенты —Луцкевічы, Астроўскія, Ярэмічы і іншыя. Яны ўсямерна садзейнічаюць фашызму ў душэньні нацыянальна - вызваленчай барацьбы, яны ашуканствамі стараюцца адвесьці вашую ўвагу ад рэвалюцыйнай барацьбы, ад абароны СССР.

Наперакор фашызму і яго памагатарам ня спыняецца рост рэвалюцыйнай хвалі на Заходняй Беларусі, павялічваюцца шэрагі барацьбітоў за вызваленьне працоўных мас, памнажаецца напорыстасьць мас у іх вызваленчай барацьбе супроць панскай акупацыі.

Усе эксплёатаваныя і беспрацоўныя гораду і вёскі, усе працоўныя сялянскія масы, усе прыгнечаныя польскім фашызмам, абрабаваныя падаткамі, змучаныя шарваркамі, пазбаўленыя роднай школы — усе гуртуйцеся пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду — Камуністычнай партыі і разгортвайце нацыянальна - вызваленчую барацьбу супроць панскай акупацыі, за школу на роднай мове, супроць удушэньня рабоча - сялянскай беларускай прэсы, супроць кулацкай камасацыі і ліквідацыі сэрвітутаў, супроць шарварак, штрафаў, падаткаў. Масава ўступайце ў арганізацыі нацыянальна - вызваленчага руху, не дапускайце да разгрому ТБШ, паўсямесна засноўвайце гурткі ТБШ. Масоўкамі, мітынгамі, магутнымі дэманстрацыямі гартуйцеся ў барацьбе, гартуйцеся да рашучых баёў да канчатковай перамогі над панаваньнем капіталістаў і памешчыкаў.

Далой падрыхтоўку нападу на СССР! Усе на абарону БССР і ўсяго СССР!

Японія разам з міжнароднымі імпэрыялістамі хоча падзяліць Кітай, заду шыць Савецкі Кітай. Выступім усе на абарону кітайскага народу і яго рэвалюцыі!

Ані граша падаткаў ураду голаду, вайны і шыбеніц!

За фабрыкі, зямлю і ўладу!

Далой белы тэрор! На барацьбу за вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў!

Далой нацыянальны ўціск! Няхай жыве права на самавызначэньне Заходняй Беларусі аж да аддзяленьня ад Польшчы!

Няхай жыве рабоча - сялянскі ўрад створаны пралетарскай рэвалюцыяй у Польшчы.

Былыя паслы БС-Р Грамады:
Сымон РАК-МІХАЙЛОЎСКІ,
Пётра МЯТЛА.

СУСТРЭЦЬ ТАРФЯНЫ СЭЗОН ВА УСЕУЗБРОЕНЬНІ

Тарфяная прамысловасьць належыць да ліку важнейшых галін апалавай індустрыі. Кожны трэці кілёват электрычнай энэргіі, які выпрацоўваецца нашымі раённымі станцыямі, атрымліваецца ў выніку спальваньня торфу.

Значэньне торфу расьце разам з ростам усёй нашай індустрыі і разгортваньнем новых прамысловых цэнтраў, якія маюць мясцовую апалавую базу ў відзе вялізарных запасаў торфу. Далейшае разьвіцьцё торфяной прамысловасьці складае актуальнейшую задачу сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта задача непасрэдным чынам выцякае з рашэньняў XVII партканфэрэнцыі, якое асабліва падкрэсьлівае важнасьць шырокага скарыстаньня мясцовых відаў апалу.

Наша торфяная прамысловасьць, якая павялічыла сваю прадукцыю за мінулы год у параўнаньні з мінулым годам на 60 проц. павінна дамагчыся ў 1932 г. новага павялічэньня здабычы торфу. Краіна павінна атрымаць у 1932 годзе 15,3 млн. тон торфу, у тым ліку ад Саюзторфу — 14,3 млн. тон. Да пачатку торфянога сэзону застаецца якіх - небудзь два месяца. Гэты час неабходна скарыстаць для самай інтэнсіўнай падрыхтоўкі да разгортваньня работ на торфяных палёх, улічыўшы ўвесь вопыт барацьбы за торф у мінулым годзе.

Ня гледзячы на вялізарнае павялічэньне здабычы торфу ў параўнаньні з мінулым годам, плян 1931 г. ня быў выкананы. Чаму гэта здарылася? Якія труднасьці трэба прадбачыць, якія меры загадзя ўжыць, каб мінулагоднія недахопы не праявіліся і ў гэтым годзе?

Перш за ўсё, торфараспрацоўкі павінны быць цалкам забясьпечаны рабочай сілай. У мінулым годзе кіраўнікі тарфяной прамысловасьці ня ўжылі ўсіх неабходных мер да гэтага, і ў рэзультаце атрымаўся значны недабор рабочых.

Стаўка на «самацёк» у наборы рабочай сілы абанкроцілася яшчэ і яшчэ раз. Аднак, далёка ня ўсё работнікі тарфяной прамысловасьці атрымалі з гэтага факту неабходныя вурокі. Указаньне тав. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы на аснове дагавораў з калгасамі ня выконваецца належным чынам. Дагэтуль не завербавана яшчэ і паловы неабходнай колькасьці рабочых. А сэзон ужо не за гарамі. Бальшавіцкі абавязак партыйных арганізацый — даць рашучы адпор ігнараваньню важнейшых указаньняў партыі.

Набор рабочай сілы павінен быць шырока разгорнуты і закончаны ў самы бліжэйшы час, пры чым у першую чаргу неабходна забясьпечыць рабочай сілай буйнейшыя, рашаючыя торфараспрацоўкі.

Побач з гэтым на торфараспрацоўках трэба рашуча палепшыць матар'яльна - бытавыя ўмовы. Гэта перш за ўсё датычыць жыльля, сталовых, пральняў, лазьняў. Ігнараваньне штодзённых патрэб тарфянікоў і тарфяніц,—а яно скрозь і ўсюды мела месца ў мінулым сэзоне. — зьяўляецца злачынствам і павінна праследавацца самым бязьлітасным чынам.

Вялізарная адказнасьць кладзецца на каапэрацыю. У мінулым сэзоне яна забясьпечвала тарфянікоў вусім нездавальняюча і гэтым ставіла пад удар адну з важнейшых галін апалавай індустрыі. Больш гэтага не павінна паўтарацца.

Рашаючай задачай тарфяной прамысловасьці зьяўляецца падвышэньне прадукцыйнасьці працы. Бяз гэтага плян 1932 г. нельга выканаць.

Важнейшым рычагом узьнятьця прадукцыйнасьці працы павінна зрабіцца перабудова сыстэмы заработнай платы. Указаньне тав. Сталіна аб ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі на торфа распрацоўках у мінулым сэзоне ня было рэалізавана. Замест індывідуальнай зьдзельшчыны панаваў дробнабуржуазны прынцып дзялёжкі заработку з «арцельнай шапкі» — «па рублю на брата». Была пашырана пачасовая форма аплаты працы. Выдучыя прафэсіі ня былі выдучаны. «Лявацкую» ураўнілаўку на торфараспрацоўках, якая так дружна падтрымліваецца правымі апартуністамі, кулакамі і падкулачнікамі, бальшавікі павінны зламаць да канца. Выгнаць ураўнілаўку з торфараспрацовак! Індывідуальную зьдзельшчыну — на тарфяныя палі! Заработак кожнага тарфянка павінен вызначацца характарам, колькасьцю і якасьцю яго работы.

Вытворчыя рэзультаты перабудовы заработнай платы будуць асабліва адчувальны, калі гэтую перабудову будзе спраўджаць рашучае ўкараненьне новых мэтадаў работы, падвышаючых прадукцыйнасьць працы. Возьме це працу на сушцы і ўборцы кавалкавага торфу. 100,000 тарфяніц, палова ўсёй колькасьці рабочых тарфяной прамысловасьці заняты сушкай і ўборкай. Работа гэтай вялізарнай армії людзей ідзе застарэлымі мэтадамі. Перадавыя ўдарнікі - рацыяналізатары высунулі новыя прыёмы работы, якія на многа ўзьнімаюць прадукцыйнасьць працы. Напрыклад, укладка торфу «зымейкай» замест ранейшай сыстэмы «пяткоў» павялічвае прадукцыйнасьць працы тарфяніц амаль удвая і дае лепшую якасьць торфу. Задача заключаецца ў тым, каб узброіць перадавымі мэтадамі ўсю армію тарфянікоў, зьнішчыць у балотах застарэлыя прыёмы работы, шырокім фронтам рушыць далей рацыяналізацыю працы.

Тарфяная прамысловасьць вусім не справілася ў 1931 г. з сушкай торфу. У радзе выпадкаў наглядалася апартуністычная недаацэнка важнасьці сушкі. Такое становішча больш не павінна мець месца. Нявысушаны торф—гэта яшчэ не апал. Нявысушаны торф—доказ небальшавіцкіх адносін кіраўнікоў тарфяных распрацовак да выкананьня сваіх абавязкаў перад сацыялістычным будаўніцтвам.

Пытаньні якасьці павінны стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх работнікаў тарфяной прамысловасьці. Кожная недасушаная тона торфу — гэта ўдар па бальшавіцкіх тэмпах. Як мага больш торфу і добрай якасьці—такая задача.

З усёй вострасьцю перад тарфяной прамысловасьцю стаіць задача зьніжэньня сабекошту. Гаспадарчы разьлік на многіх тарфяных прадпрыемствах нават і фармальна не ажыцьцёўлены. Прадоўжваюць жыць і працаваць па - старынцы за «кошт казны», не спраўляючыся ні з прыбыткамі, ні са стратамі. Гэта прывяло да таго, што рост заработнай платы далёка абагнаў рост прадукцыйнасьці працы. Заработная плата пер

Канкрэтнае кіраўніцтва з боку райкомаў сеткай партасьветы,

падвышэньне кваліфікацыі прапагандысцкіх кадраў— аснова ўзьняцьця якасьці работы па марксысцка-ленінскім выхаваньні

Узьняць якасьць работы сеткі партвучобы

Марксыцка-ленінская тэорыя ёсьць магутнейшы сродак барацьбы за генэральную лінію нашай партыі.

Гігантскія, сусьветна-гістарычнага значэньня, сацыяльныя зрухі, якія адбыліся ў нашай краіне, вялізарнейшыя задачы, якія пастаўлены 17-й Усесаюзнай партканфэрэнцыяй, задачы зьнішчэньня клясаў і канчатковай ліквідацыі прычын, якія параджаюць эксплёатацыю чалавека чалавекам зусім па іншаму і з асаблівай вострасьцю ставяць пытаньне аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй, аб падрыхтоўцы бальшавіцкіх кадраў здольных правільна арыентавацца ва ўсіх асаблівасьцях сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

«Нам неабходна ўзброіць кожнага камуніста разуменьнем асаблівасьцяй і задач сучаснага этапу барацьбы за сацыялізм, для ўзначальваньня мас, для пасьпяховага кіраўніцтва імі ў барацьбе за хутчэйшую ліквідацыю нашай тэхнічна-эканамічнай адсталасьці. Такі стрыжань марксыцка-ленінскага выхаваньня на сучасным этапе, ім неабходна прасякнуць увесь зьмест марксыцка-ленінскага выхаваньня, выкоўваючы ў членаў бальшавіцкай партыі высокі тэарытычны ўзровень, ідэёвую стойкасьць, умень не кіраваць масамі ў новых умовах». (Постышаў).

У 1931-32 годзе мы ва ўмовах БССР бязумоўна маем рад посьпехаў у галіне разгортваньня сеткі школ партыйнай вучобы, у галіне ахопу партыйцаў, беспартыйных рабочых і калгасьнікаў вучобаю. Некаторыя дасягненьні ёсьць і ў галіне якасьці работы школ і гурткоў.

Аднак, трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што пастаноўку партыйнай вучобы, што работу партшкол і гурткоў у значнай частцы раёнаў, ні ў якім разе нельга прызнаць здавальняючай.

Матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем, гаворыць аб неразуменьні вялізарнейшай важнасьці і неабходнасьці ўзброеньня камуністаў марксыцка-ленінскай тэорыяй у многіх партыйных ячэйках. І адсюль шматлікія факты зрываў заняткаў у школах, адсутнасьць штодзённага дыфэрэнцыраванага кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце школ, няўважлівыя адносіны да ўнамплентаваньня школ прапагандысцкімі кадрамі і г. д.

Зусім зразумела, што пры такіх умовах нельга гаварыць аб якасьці работы школ, нельга гаварыць аб глыбокім вывучаньні марксызму-ленінізму, нельга гаварыць аб узьняцьці бальшавіцкай пільнасьці і непрыміримасьці партыйных арганізацый да ўсяніх ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Новая абстаноўка, новыя вялізарнейшыя задачы, якія стаяць перад намі, патрабуюць ад усіх партыйных арганізацый нарэшце палепшаньня работы сеткі патрвучобы ў напрамку за бесьпячэньня бесьперабойнай работы і рашучага ўзьняцьця якасьці выкладаньня ў школах. Гэта магчыма толькі пры ўмовах калі справа ўзбраеньня партыйных мас тэорыяй Маркса, Леніна і Сталіна будзе пастаўлена ў цэнтры ўвагі работы партыйных арганізацый, калі будзе сыстэматычна праводзіцца работа па ўзьняцьці тэарэтычнай падрыхтоўкі і кваліфікацыі прапагандысцкіх кадраў, калі райкомы КП(б)Б будуць ажыцьцяўляць штодзённае канкрэтнае дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва работай школ і гурткоў.

Партвучоба—справа ня толькі прапагандыста, а ўсёй партячэйкі

Партыйная ячэйка грузчыкаў станцыі Менск работай сваёй першапачатковай партыйнай школы зусім не цікавіцца. Уся адказнасьць за работу школы ўскладзена на кіраўніка, які без дапамогі ячэйкі бязумоўна ня можа забясьпечыць бесьперабойную работу школы.

Пры арганізацыі ў школу запісалася больш 20 чал. партыйцаў і беспартыйных. Але з самага пачатку больш палавы запісаўшыхся школу не наведваюць. Пастаянныя дні вучобы сыстэматычна зрываюцца з-за розных сходаў, нарад, паседжаньняў, якія «неабходна правесьці безадкладна і імена ў гэтыя дні». Памяшканьнем школу таксама не забясьпечылі і кожны раз перад заняткамі, трэба шукаць «дзе прытуліцца». Праўда, апошнія не калькі заняткаў праведзены ўжо «ў пастаянным» памяшканьні—ў багажнай. Але холад, бруд, шум, які ўвесь час пануе ў гэтым памяшканьні ні ў якім разе не спрыяюць пасьпяховаму правядзеньню заняткаў.

Якасьць вучобы, якая праходзіць у такіх умовах, зусім зразумелая. Слухачы ні ў якім разе ня могуць добра ўсьвядоміць сабе тэмы, якія з імі распрацоўвае прапагандыст. Прапагандыст у сваю чаргу, ня можа як сьлед разгарнуць вучобу школы.

Кіраўнік школы не аднойчы ставіў пытаньне аб рабоце школы перад бюро ячэйкі, але вынікаў ніякіх няма. Гарком павінен прыняць адпаведныя меры якія-б прымусілі партячэйку грузчыкаў заняцца вучобай сваіх партыйцаў і беспартыйных рабочых.

В.

За бязвую рэалізацыю пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі

Для прапрацоўкі ітогаў 14-га зьезду КП(б)Б і 17-й Усесаюзнай партканфэрэнцыі Крупскі РК КП(б)Б склікаў раённы сход членаў і кандыдатаў партыі. З дакладам выступіў сакратар РК КП(б)Б т. Штэйнгард.

Сход аднадушна ўхваліў і далучыўся да пастаноў 14-га зьезду КП(б)Б і 17-й Усесаюзнай партканфэрэнцыі. Сход даручыў бюро РК накіраваць увесь раённы актыў у сельсаветы для папулярызацыі гэтых гістарычных рашэньняў і для разгортваньня масавапалітычнай работы па пасьпяховым выкананьні задач 4-га заключнага году пяцігодкі, ліквідацыі прарываў у загатоўках лёну і разгортваньня падрыхтоўкі да 3-й бальшавіцкай сяўбы.

У выкананьне пастановы раённага сходу, бюро РК накіравала ў сельсаветы 32 чал. з раённага партактыву. (Белта).

Няўвязка вучобы з практыкай—асноўны недахоп работы школ

Дуброўна. Сетка партасьветы і колькасны ахоп ёю ў гэтым годзе ў раёне значна пашыраны. У мінулым годзе было ўсяго 11 партшкол, а зараз ёсьць 33 школы і ахоплена імі 822 слухача.

Але ўсё-ж партарганізацыя ахоплена вучобай усяго на 64 проц. У ячэйках МТС і каапэрацыйнай партвучоба пастаўлена зусім дрэнна, партыйцы амаль зусім не наведваюць заняткі ў школах. На фабрыцы «Дубровенская Мануфактура» вучоба амаль правалена, галоўным чынам таму, што пры арганізацыі партшкол не ўлічылі неабходнасьць стварэньня іх на мовах нацменшасьцяй.

Галоўным недахопам работы школ у Дуброўне зьяўляецца тое, што тэарэтычная распрацоўка тэм не ўвязваецца з практычнай працай партарганізацыі.

Выпраўленьне гэтых недахопаў пад высьць зацікаўленасьць слухачоў, ліквідуе цякучасьць складу школ і забясьпечыць выкананьне пастаноў партыі аб разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня. (Белта).

Навярстаць упушчаны час

Талочын. Партыйная ячэйка Старасельскага с.-с. дагэтуль яшчэ не зняла падрыхтоўкай да 3-й бальшавіцкай вясны. Насенфонды ў калгасах ня створаны, ачыстка насеньня не праводзіцца, с.-г. інвэнтар не рамонтуецца, у калгасах няма яшчэ вытворчых плянаў.

Між тым, кантрольныя тэрміны падрыхтоўкі да сяўбы надыходзяць. Навярстаць упушчанае магчыма толькі пры максымальным напружаньні ўсіх сіл партыйнай ячэйкі, сельсавету і ўсёй грамадзкасьці. Далейшая марудносьць нямінуча прывядзе да зрыву пасеўкампаніі па сельсавеце. Гэта павінна ўлічыць партячэйка Старасельскага с.-с.

Аг.

Бальшавіцкім правядзеньнем веснавой сяўбы— змагацца за пачэснае месца перадавога раёну

Сёньня мы зьмяшчаем ліст раённага зьлёту ўдарнікаў калгасаў і саўгасаў Мсьціслаўскага раёну. Ударнікі Мсьціслаўскага раёну, вітаючы арганізаваную газ. «Известия» перакліччку, спаборніцтва перадавых раёнаў СССР—зварочваюцца да ўсіх раёнаў БССР з прапановай арганізаваць усе беларускае спаборніцтва раёнаў БССР на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

Ініцыятыва мсьціслаўскіх ударнікаў павінна быць падхопленa ўсімі раёнамі БССР. Гэта спаборніцтва павінна пераварыцца ў магутны рычаг барацьбы за пасьпяховае правядзеньне 3-й бальшавіцкай вясны,—за вырашэньне задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Райпартарганізацыі і РВК павінны ўзначаліць—арганізаваць гэту перакліччку раёнаў шляхам разгортваньня спаборніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі, саўгасамі і МТС.

Барацьба за свячасовую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы, за вытворчы плян сяўбы на аснове ўкараненьня дасягненьняў агратэхнікі, за правільную брыгадную арганізацыю калгаснай работы на аснове зьдзельшчыны, за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна ў калгасах, саўгасах і МТС—вось вузлавыя пытаньні, пад знакам выкананьня якіх павінна праходзіць усебеларускае спаборніцтва раёнаў БССР.

Мсьціслаўскі раён вылучан ад БССР для ўдзелу ў перакліччы-спаборніцтве перадавых раёнаў СССР. Аднак гэта не азначае, што пачэснае месца перадавога раёну застанецца толькі за ім.

За пачэснае месца перадавога раёну павінны змагацца ўсе раёны БССР ударным выкананьнем усіх гаспадарча-палітычных задач і ў першую чаргу ўзорным правядзеньнем трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Уступаючы ў сацыялістычнае спаборніцтва раёнаў БССР на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, трэба падкрэсьліць, што пачэснае месца перадавога раёну «застанецца за тым раёнам, які сапраўды па-бальшавіцку правядзе пасеўную кампанію» (з ліста А. Г. Чарвякова калгасьнікам).

Пад знакам сацспаборніцтва, увязваючы арганічна гэту работу з конкурсам «Правды»—на барацьбу за ўдарнае правядзеньне веснавой сяўбы, за права заняць пачэснае месца перадавога раёну!

За моцную калгасную брыгаду, за бальшавіцкі ўраджай

ДА ЎСІХ УДАРНІКАЎ РАБОЧЫХ САЎГАСАЎ, КАЛГАСЬНІКАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС АДНААСОБНІКАЎ

(З адкрытага ліста ўдарнікаўМсьціслаўшчыны)

Паважаныя таварышы!

Па ініцыятыве Сінельнікаўскага раёну УССР, газэта «Известия» разгарнула перакліччку-спаборніцтва саветаў перадавых раёнаў Саюзу па пытаньнях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, перабудовы саўгасаў, падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Наш зьлёт ударнікаў Мсьціслаўшчыны, абгаварыўшы чарговыя задачы барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, барацьбы за бальшавіцкі ўраджай чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі, абвяшчае сацыялістычны раённы паход ударнікаў па ліквідацыі прарываў па ўсіх відах загатовак, разгортваньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Высоўваючы сустрэчныя пляны па загатоўках, мы бярэм абавязацельствы дабіцца перавыкананьня плянаў—па збожжазагатоўках на 30-50 пр., па лёнавалакне—на 10-20 проц., па мясазагатоўках—20-30 проц., датэрмінова перавыканаць плян загатовак насенных матар'ялаў і плян мабілізацыі сродкаў.

Цьвёрда памятаючы, што барацьба за бальшавіцкі ўраджай, за высокая якасныя паказьнікі работы на аснове практычнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, за аўладаньне тэхнікай і агратэхнікай ёсьць барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—мы паставілі перад сабой галоўную задачу—правесьці веснавую сяўбу ў раёне на працягу 15-20 дзён. Мы высоўваем сацыялістычны рахунак перадавым калгасам раёну скарацыць гэты тэрмін у парадку сустрэчных плянаў да 10-15 дзён, даўшы канкрэтныя паказьнікі якасьці сяўбы, аўладаньня тэхнікай і агратэхнікай.

Высунуты нашым раёнам сустрэчны плян веснавой сяўбы, які прадугледжвае папраўленьне пасеўплошчы супроць 1931 году на 125 проц. (плошчы пад тэхкультурамі на 200 проц. і кармавыя культуры—145 проц.)—мы лічым зусім рэальным, гэты плян можа быць ня толькі выкананым, але і перавыкананым.

Выкананьне праграмы веснавой сяўбы патрабуе чоткай бальшавіцкай работы ўсіх раённых зьвеньняў, усіх ударнікаў і шырокіх калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў. Калгасная брыгада гэта важнейшае зьвяно павінна адыграць вызначную ролю ў барацьбе за бальшавіцкі ўраджай, за тэмпы і якасьць работы, за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Адным з мэтадаў барацьбы за бальшавіцкі ўраджай мы высоўваем раённую перакліччку абмену вопытам на лепшую падрыхтоўчую работу да сяўбы. Разгортваючы раённую перакліччку сацспаборніцтва, абмену вопытам работы ў падрыхтоўцы да сяўбы сельсаветаў, саўгасаў, калгасаў, брыгад, мы выклікаем праз цэнтральны друк ударнікаў іншых раёнаў БССР уключыцца ў нашу перакліччку з тым, каб на вопытах лепшай работы вучыцца і вучыць адстаючых.

Мы лічыць, што высунуты намі мечэк сустрэчных плянаў і іх абгаварэньне павінен стаць масавым паходам за бальшавіцкі ўраджай, за аўладаньне тэхнікай і агратэхнікай, барацьбы за моцны калгас, за моцную ўдарную калгасную брыгаду.

Па даручэньні зьлёту ўдарнікаў.

Прэзыдыум зьлёту.

Узоры бальшавіцкай падрыхтоўкі да сяўбы

Слуцак. Падрыхтоўка да 3-й бальшавіцкай пасьпяхова праходзіць у радзе калгасаў раёну. Разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшую падрыхтоўку да сяўбы. Шмат калгасаў падрыхтаваліся ўжо да выезду ў поле.

Калгас імя 6 зьезду саветаў закончыў падрыхтоўку да сяўбы. Насеньне сабрана і ачышчана, с.-г. машыны і інвэнтар адрамантаваны, уся зброя ў поўнай гатоўнасьці і падабрана да кожнага каня, кармовыя фонды на час палявых работ забраніраваны.

Вялікую работу ў падрыхтоўцы да сяўбы правяла калгасная газэта-пяцідзёнка «Ударнік», якая мабілізавала ўвагу калгасьнікаў на ўдарнае правядзеньне гэтай работы.

У калгасе імя Леніна таксама шырока разгорнута падрыхтоўка да сяўбы, арганізаваны рамонтныя брыгады, насенны фонд поўнасьцю створаны, мінэральнае ўгнаеньне—палка і фасфарытная мука завезены, рэгулярна зьбіраецца попел, добра наладжаны догляд за коньмі.

Калгас імя Леніна добра справіўся і з выкананьнем плану загатовак. Так, плян загатовак збожжа выкананы з перавышэньнем—замест 30 тон калгас здаў (прадаў) 35 тон.

У калгасе «Новы будаўнік» насенныя фонды поўнасьцю створаны, насеньне ачышчана на 100 проц. Калгас вывез 700 вазоў гнёю з броварнага заводу.

Добра разгарнулася работа па падрыхтоўцы да сяўбы і ў калгасе «Памяць Ільліча». Насенныя фонды сыпаны, праводзіцца рамонт інвэнтара. Паміж паасобнымі брыгадамі разгарнута сацспаборніцтва на лепшае выкананьне даручаных работ. Калгасьнікі калгасу «Памяць Ільліча» выклікалі на сацспаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да сяўбы калгас «Хвалы рэвалюцыі».

Усе адстаючыя калгасы раёну павінны браць прыклад з перадавікоў.

Я. Лугавы.

Выязднае пасяджаньне цэнтральнай конкурснай камісіі ў Слуцку

СЛУЦАК. (Па тэлеф. ад нашага спэцкора). 16 лютага ў Слуцку адбылося чарговае пасяджаньне Цэнтральнай камісіі па правядзеньні конкурсу «Правды» на лепшую работу нізавога друку па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. На пасяджаньні камісіі былі заслуханы даклады 12 рэдакцый насьцентаазэт саўгасаў і калгасаў Слуцкага, Любаньскага, Капыльскага і Старадарожскага раёнаў аб ходзе конкурсу. Пасяджаньне адбылося пры шырокім удзеле раённага актыву, рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў.

З вялікай прамовай аб задачах калгаснага будаўніцтва і барацьбы за бальшавіцкі ўраджай чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі выступіў сакратар Слуцкага РК КП(б)Б тав. Соскін.

18 лютага конкурсная камісія выехала ў калгас «Случ», адзін з перадавых калгасаў. Там быў праведзены масавы мітынг, які прыцягнуў шырокія колы калгасьнікаў.

У адзнаку конкурсу «Правды» калгасьнікі калгасу «Случ», выканаўшы поўнасьцю плян загатовак, высунулі сустрэчны плян здачы ліцкаў збожжа ў 2 цнт. і выклікалі калгас «Камбайн».

Гірко.

Вучыцца на прыкладах саўгасу Цішаўка

Магілеў. (Наш кар.). Пробны выезд у поле, які арганізаваў саўгас Цішаўка, паказаў, што па асноўных работах саўгас гатоў да сяўбы.

Машыны, с. г. інвэнтар, транспарт—у парадку. Усе машыны, інвэнтар і зброя пранумараваны і замацаваны за рабочымі. Рамонт скончыўся на месяц раней тэрміну. Гэтая перамога дасягнута дзякуючы рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. З самага пачатку разгортваньня падрыхтоўчай работы да пасеўкампаніі, цэхам была ліквідавана абязьлічка ў карыстаньні інвэнтаром, машынамі, кузьня была пераведзена на гаспадарчы разьлік. Плян рамонту быў свячасова даведзены да кавалёў.



Першы савецкі электраплуг, двухлемешнай сыстэмы, канструкцыі Арлоўскага заводу імя т. МЕДЗЬВЕДЗЕВА.

Добра паказаў сябе ў рабоце каваль Багамолаў, які абвясьціў сябе ўдарнікам, абавязаўся добра выкананць і свячасова скончыць рамонт. Ударныя тэмпы праяўіў у рамонце і пісьляр Станкевіч Восіп. Дзякуючы сумленнай рабоце на аснове зьдзельшчыны, Станкевіч скончыў выкананыя яму работы на месяц раней.

Наводле плану, саўгас павінен заласьці 400 парніковых рам, якія цалкам зроблены. Да 15 сакавіка трэба закласьці 500 парніковых рам. У гэтым напрамку вядзецца ўдарная работа. Вывезена гною на 550 парнікоў. Дрэнна праходзіць вязка мат. Да 25 лютага патрэбна было звязаць 500 мат, а да гэтага часу звязана каля 100 мат.

Саўгас павінен узмацніць тэмпы вывазкі гною. Наводле плану трэба вывезьці 7.300 тон, а да гэтага часу вывезена ўсяго 800 тон.

На мітынгу, прысьвечаным пробнаму выезду ў поле, рабочыя саўгасу абвясьцілі сябе ўдарнікамі 3-ей бальшавіцкай і абавязаліся яшчэ вышэй узьняць тэмпы падрыхтоўкі.

А. Нёманскі.

Н. Асауляк

Некаторыя вынікі работы сеткі партасьветы ў жывёлагадоўчых раёнах БССР

Асноўная задача марксыцка - ленінскага выхаваньня ў жывёлагадоўчых раёнах, як і ва ўсёй БССР, выходзіць з таго палажэньня, што: «нам неабходна ўзброіць кожнага камуніста разуменьнем асаблівасьцяй і задач сучаснага этапу барацьбы за сацыялізм, для ўзначаленьня мас, для пасьпяховага кіраўніцтва імі ў барацьбе за хутчэйшую ліквідацыю нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці. Такі стрыжань марксыцка - ленінскага выхаваньня на сучасным этапе. Ім неабходна правіяць увесь зьмест марксыцка-ленінскага выхаваньня, выкоўваючы ў членаў бальшавіцкай партыі высокі тэарэтычны ўзровень, ідэйную цьвёрдасьць, уменьне кіраваць масамі ў новых умовах» (П. Постышаў).

Папярэднія вынікі разгортваньня сеткі партасьветы, у жывёлагадоўчых раёнах БССР, сьведчаць аб значным колькасным росьце ахопу партшколамі, як нізавымі, так і сярэднімі яе зьвеньнямі партыйцаў і беспартыйнага рабочага - калгаснага актыву. Гэта відаць хоць - бы з таго, што сеткай партасьветы ў 1930 г. па ўсіх сельскіх раёнах БССР было ахоплена 9247 чал., у той час, калі ў сьнежні 1931 г. ніжэйшымі і сярэднімі зьвеньнямі партасьветы па 31 жывёлагадоўчым раёне (усяго ў БССР 46 жывёлагадоўчых раёнаў) ахоплена 20.057 чал. Гэта лічба сьведчыць аб палітычным і культурным росьце мас, аб узрошчай цязе да аўладаньня марксыцка - ленінскай тэорыяй.

Характарным у разгортваньні сеткі партасьветы ў гэтым годзе зьяўляецца тое, што намецілася поўны пералом у галіне кіраўніцтва марксыцка - ленінскім выхаваньнем з боку большасьці раённых і нізавых партарганізацый, што марксыцка - ленінскае выхаваньне робіцца справай ня толькі паасобных членаў партыі, а справай усёй партарганізацыі ў цэлым. Асабліва ясна відаць гэта з праведзенай партарганізацыямі работы ў часе камплектаваньня сеткі партасьветы, калі гэта работа была ператворана ў масавую палітычную кампанію. Задачы марксыцка - ленінскага выхаваньня абгаварваліся на пленумах і бюро РК, на нарадах сакратароў ячэек, на партсходах і г. д.

Кантрольнымі лічбамі культпропу ЦК КП(б)Б намечана ахапіць усімі зьвеньнямі партыйнай асьветы па 46 жывёлагадоўчых раёнах 32.939 партыйцаў і беспартыйнага рабоча-калгаснага актыву. На 1-XII 1931 г. па 31 раёне, прадставіўшым весткі, ахоплена 20.057 чал., (90 проц. да намётак ЦК для 31 раёну). Паасобныя партарганізацыі перавыканалі агульны плян (Койданаўскі раён — 165 проц., Клічаўскі—110 проц., Лагойскі — 152 проц. і інш.). Побач з гэтым мы маем такія раёны, якія фактычна правальваюць работу па правядзеньні партасьветы, якія кантрольныя лічбы ня выканалі, недазаніялі ўсёй важнасьці гэтай работы, прадставілі яе самацёку (Веткаўскі раён—38 проц., Прапойскі — 35 проц., Церахаўскі — 45 проц. і інш.).

Значна павялічыўся ахоп партыйцаў сеткай партасьветы. Члены партыі ахоплены школамі на 70,4 проц., кандыдаты партыі — 72,4 проц. (у 1930 г. было ахоплена 30 проц. арганізацыі).

Але гэты процант зьяўляецца далёка недастатковым, (асабліва ахват кандыдацкага складу) таму, што ў некаторых партарганізацыях партвучобай ахоплены менш паловы партыйцаў (Прапойскі раён — ахоплена членаў КП(б)Б — 29 проц., кандыдатаў—39 проц., Хойніцкі ў тым - жа парадку—32 проц і 56 проц., Церахаўскі — 36 проц. і 31 проц., Лоеўскі — 30 проц. і 50 проц.).

У жывёлагадоўчых раёнах ніжэйшымі і сярэднімі зьвеньнямі партасьветы ахоплена беспартыйнага рабоча - калгаснага актыву 51,5 проц., членаў ЛКСМ — 16 проц., жанчын — 15 проц., да ўсяго складу слухачоў партыйцаў.

Адным з недахопаў укамплектаваньня сеткі зьяўляецца тое, што ў радзе выпадкаў партарганізацыі ня ўлічылі неабходнасьці арганізацыі партшкол на мовах нацменшасьцяў, не надалі гэтаму пытаньню належнай увагі (Хойніцкі, Плешчаніцкі, Слуцкі, Брагінскі і інш. раёны) у выніку чаго, толькі 9 школ працуюць на польскай мове і 5 на яўрэйскай. Гэта колькасьць школ на мовах нацменшасьцяў ва ўмовах БССР, дзе значную частку насельніцтва складаюць палякі і яўрэі, зьяўляецца надзвычайна недастатковай. Партарганізацыі цяпер у працэсе работы партшкол, павінны запоўніць гэты прабел.

Пераважная большасьць слухачоў сеткі партасьветы ахоплена пачатковымі партыйнымі школамі (13,611 чал.). Значна ўзрасло сярэдняе зьвяно—ВСПШ, якім ахоплена 1917 чал., кандыдацкімі школамі ахоплена 678 чал., што бязумоўна пры той колькасьці кандыдацкага складу партарганізацыі, якую мы маем (3761 чал.) зьяўляецца надзвычайна недастатковым.

Раённы партыйны актыў у асноўным ахоплены дэкаднымі камвузамі, ВСПШ і завочнымі формамі партвучобы. Ня гледзячы на колькасна здавальняючы ахоп, пытаньне вучобы партактыву зьяўляецца адным з актуальнейшых пытаньняў партасьветы, таму што актыў крайне напружаны практычнай работай і мала аддае ўвагі падвышэньню свайго тэарэтычнага ўзроўню. Рай комы партыі павінны сур'ёзна ўзяцца за гэты адказьнейшы вучастак партработы, павінны стварыць умовы для сыстэматычнага падвышэньня тэарэтычнага ўзроўню актыву. Ад гэтага будзе залежыць і пасьпяховае правядзеньне практычных задач, што стаяць перад партарганізацыяй ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

Другі ня менш важны вучастак у партасьвеце — гэта вучоба кандыдатаў і маладых членаў партыі, якія прышлі да нас нядаўна. Гэта лепшы ўдар ніж з вытворчасьці, гэта перадавікі калгаснага будаўніцтва, даверыўшыя на справе сваю адданасьць справе пралетарыяту, але надзвычайна слаба ўзброеныя марксыцка - ленінскай тэорыяй. Задача партарганізацый ня толькі ўцягнуць іх у школу і на гэтым супакоіцца, а задача ў тым, каб выхоўваць іх у штодзённай практычнай рабоце, уцягваць іх у партыйную работу, даваць партнагрузкі па іх сіле і дапамагаць у іх выкананьні, больш рашуча высоўваць на паасобныя кіруючыя вучасткі партыйнай і гаспадарчай работы.

Вялікім недахопам у разгортваньні сеткі партасьветы зьяўляецца тое, што партарганізацыі дабіўшыся значных посьпехаў у колькасным ахопе, не замацавалі гэтую колькасьць на ўвесь час работы школ, некаторыя ячэйкі не забясьпечылі школы необходнымі памяшканьнямі, сьвятлом, не замацавалі пэўныя дні партвучобы, абмяжаваўшыся толькі вынясьненым пастаноў па гэтым пытаньні, а да зрыўшчыкаў гэтых пастаноў не прымянялі неабходных мер спагнаньня; несвячасова і далёка няпоўнасьцю забясьпечылі школы неабходнай колькасьцю прапагандыстаў, не гаворачы ўжо аб іх якасным складзе. У выкананьне гэтага наведваемасьць, за выключэньнем адзінак (Койданава, Быхаў) слухачамі вельмі нізкая, хістаецца паміж 30—50 проц. усяго складу школ, апроч гэтага маюць месца частыя зрывы заняткаў.

Асноўнай і цэнтральнай задачай партыйных арганізацый цяпер зьяўляецца ўзмацненьне штодзённага кіраўніцтва сеткай партасьветы, шляхам пляннавага абсьледваньня і інструктажу іх, заслуханьня на бюро РК дакладаў сакратароў ячэек, сельпарткомаў і прапагандыстаў аб ходзе партвучобы.

Другім рашаючым пытаньнем партыйнай асьветы зьяўляецца пытаньне аб прапагандысцкіх кадрах, іх колькасным і якасным складзе. У гэтых адносінах трэба канстатаваць той факт, што прапагандысты жывёлагадоўчых раёнаў як і па ўсёй БССР зьяўляюцца адным з «вузкіх месц» у партасьвеце.

Такое становішча з прапкадрамі зьяўляецца галоўным чынам вынікам таго, што на працягу апошніх 2-3 год, у значнай частцы партарганізацый прапкадры не замацоўваліся на прапагандысцкай рабоце, а разбазаваліся, пасылаліся на іншую работу, не зьвязаную з іх кваліфікацыяй. Фактычна здабывалася ўцечка прапкадраў з году ў год. Па-другое — партыйныя арганізацыі ня гледзячы на рад дырэктыў культпропу ЦК аб падыхтоўцы і перападрыхтоўцы прапагандыстаў праз усе магчымыя кароткатэрміновыя курсы не правялі гэтай работы, а ў большасьці сарвалі яе. Праведзеныя курсы ў цэлым радзе выпадкаў не далі належных рэзультатаў, таму што на курсы пасылаліся кандыдаты партыі і камсамольцы слаба падрыхтаваныя. У рэзультаце гэтага па скончэньні курсаў на прапрабоце можна было скарыстаць па 3—5 чал. у раёне.

Па-трэцяе — недастаткова прыцягнуты да прапагандысцкай работы стары бальшавікі, кіруючы партактыў. Сярод часткі партактыву яшчэ не лік відаваны разважаньні, што справа мар ксыцка - ленінскага выхаваньня парт арганізацыі — справа прапагандыстаў, а ня ўсёй партарганізацыі ў цэлым. Чацьвертае, — гэта тое, што партарганізацыі не вялі і ня вядуць сыстэматычнай работы па падвышэньні тэарэтычнага ўзроўню прапагандыстаў, не падвышаюць іх кваліфікацыі.

У рэзультаце гэтага колькасны склад прапагандыстаў крайне недастатковы і асабліва дрэнна абстаіць справа з іх тэарэтычнай падрыхтоўкай. Большасьць прапагандыстаў маюць веды ў аб'ёме ВСПШ і кароткатэрміновых курсаў. Рад таварышоў упярыню прышлі на прапработку, ня маюць у гэтай рабоце навыку і вопыту. У сувязі з гэтым мы маем у рабоце школ ідэалёгічныя скажэньні, нячоткасьці фармулёвак. Паасобныя прапагандысты тлумачаць, што «раскол партыі сац.-дэмакратаў на бальшавікоў і меншавікоў адбыўся пасьля рэвалюцыі, калі стала пытаньне каму браць уладу ў свае рукі і Ленін заставаўся ў меншасьці». На пытаньне аб тым, чаму партыя праводзіць калгаснае будаўніцтва і ліквідацыю кулацтва як клясы, адзін прапагандыст адказвае: «перарастаньне беднякоў у кулака прымусіла партыю стаць на шлях калектывізацыі». І далей, на пытаньне хто стаяў на чале правага ўхілу, адказвае: «Сырцоў, Ламінадзе», а потым напэўнена дадае — Бухарын. Ці, «хто каго» тлумачыцца, што «гэты лёзунг высунуты тав. Сталіным у апошні час», і г. д.

Такое становішча ва ўсёй сваёй шырыні ставіць перад партарганізацыямі задачу ў галіне партасьветы рашуча змагацца за якасьць, за ідэалёгічную вытрыманасьць, за правільнае тлумачэньне і ўкараненьне марксыцка-ленінскай тэорыі. Нам трэба такая партыйная асьвета, якая забясьпечыць выхаваньне мас з марксыцка - ленінскім светапогляданам, якая выхоўвае бальшавікоў, здольных правільна праводзіць генэральную лінію партыі ва ўсёй сваёй рабоце.

Другі прабел у партасьвеце, выцякаючы з дрэннай якасьці прапкадраў—гэта няўменьне ўвязаць прапрацоўваемыя пытаньні з пытаньнямі, якія стаяць перад партарганізацыямі ў галіне выкананьні гаспадарча - палітычных задач, высунутых і высоўваемых партыяй на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Школы ў жывёлагадоўчых раёнах яшчэ на павярнулі ся тварам да сваёй вытворчасьці, пабальшавіцку не змагаюцца за пасьпяховае выкананьне задач, высунутых у адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК, задач, якія ў асноўным зводзяцца да таго, што 1931-32гг. павінны быць гадамі таго-ж рашучага пералому ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 г. г. ў справе арганізацыі сацыялістычнай зярнёвай гаспадаркі.

Гэты прабел у рабоце сеткі партасьветы фактычна прыводзіць да адрыву тэорыі ад практыкі. На ліквідацыю яго партарганізацыі павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, бо нам патрэбна ня ўсялякая прапаганда, нам патрэбна сапраўды бальшавіцкая прапаганда, якая-б дапамагала партаргнізацыям у выкананьні задач пастаўленых перад імі партыяй на даным этапе будаўніцтва сацыялізму у рэалізацыі шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, якія забясьпечваюць пасьпяховае правядзеньне гэтых задач.

У рабоце друку ў галіне яго барацьбы за марксыцка - ленінскае выхаваньне неабходна разглядаць два пэрыяды: першы пэрыяд — гэта ў часе разгортваньня сеткі партасьветы, кал. газэты сыстэматызавалі работу, мабілізоўвалі партыйныя масы, дапамагалі партарганізацыям у барацьбе за арганізацыю марксыцка - ленінскага выхаваньня і бязумоўна дамагліся значных посьпехаў і другі пэрыяд — калі газэты ў большасьці сваёй, асабліва раённыя і тым больш насьцепныя і шматтыражныя заспакоіліся на дасягнутых посьпехах. Друк, асабліва раённы і нізавы не вядзе дастатковай барацьбы за якасьць, за замацаваньне праведзенай работы ў часе разгортваньня партасьветы, фактычна прадаставіўшы гэту справу самацёку. Друк не вядзе сыстэматычнай работы, а праводзіць яе ад выпадку да выпадку. Неабходна неадкладна ліквідаваць гэты буйнейшы недахоп: весьці разам з партарганізацыямі сыстэматычную работу па ўзбраеньні мас марксыцка-ленінскай тэорыяй, мабілізоўваць масы на ліквідацыю прарываў у партасьвеце.

Вынікі разгортваньня партасьветы ў жывёлагадоўчых раёнах і тыя задачы марксыцка - ленінскага выхаваньня, якія з асаблівай вострасьцю ставіць тав. Сталін у сваім лісьце ў часопіс «Пролетарская революция», патрабуюць ад партарганізацый карэнная пералому ў кіраўніцтве, патрабуюць кіраўніцтва канкрэтнага, дыфэрэнцыяванага, патрабуюць падвышэньня якасных паказьнікаў, патрабуюць ідэалёгічнай чыстаты выкладаньня марксыцка - ленінскай тэорыі, патрабуюць барацьбы за дзейнасьць бальшавіцкай прапаганды. Выкананьне гэтых задач залежыць, галоўным чынам, ад якасьці работы з прапагандыстамі, ад апэрацыйнасьці кіраўніцтва імі.

Такава абстаноўка, такавы задачы, якія стаяць перад марксыцка - ленінскім выхаваньнем. «Работа па марксыцка - ленінскім выхаваньні павінна праходзіць пад знакам выкоўваньня стойкіх бальшавікоў, якія арыентуюцца на сучасных абставінах сацыялістычнага будаўніцтва, усьвядомілі багатае гістарычнае мінулае нашай партыі, усьвядомілі вопыт барацьбы партыі на два фронты, уявілі сабе сувязь нашай сацыялістычнай будоўлі з барацьбой сусьветнага пралетарыяту, здольных

Лясная эстафэта

Бесьперапынным прытокам лесу

ліквідаваць нястачу сыравіны на заводах

Рад леспрамгасаў зрываюць дастаўку сыравіны для лесазаводаў. Гэта па-сутнасьці тармозіць выкананьне вытворчых праграм, перашкаджае разгортваньню ударнай работы на заводах. Рад леспрамгасаў не забясьпечылі бесьперабойную прывозку лесу. Гэта ставіць пытаньне аб рэзкім узмацненьні кіраўніцтва вывазкай матар'ялаў для заводаў. Такі абавязак ляжыць на ўсіх партыйных ячэйках, на ў іх лесазагатоўчых арганізацыях.

Даць камбінату сыравіну

Становішча з забясьпечаньнем камбінату лесасыравінай, з прычыны невыкананьня фадам леспрамгасаў заданьняў па вывазцы лесу, зьяўляецца надзвычайна напружаным. У апошнія дні рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны персанал зьвярнуліся з адозвай да леспрамгасаў і Жлобінскага чыгуначнага раёну аб фарсаваньні дастаўкі сыравіны камбінату.

Аднак, да гэтага часу пералому няма.

На 25 студзеня Бабруйскім леспрамгасам вывезена камбінату толькі 150 кубаметраў сыравіны.

За гэты-ж час Бабруйскім леспрамгасам дастаўлена камбінату чыгункай 10 вагонаў і Жлобінскім раёнам—51 вагон, што складае 950 куб. мтр. Асіповіцкі леспрамгас, які павінен даць камбінату 11.500 кбм., даў усяго 4 вагоны, або 60 кбм.

Асіповіцкі леспрамгас, які зьяўляецца галоўным пастаўшчыком сыравіны для камбінату, праяўляе злачынную бязьдзейнасьць.

— Якая мне справа да вашага камбінату? Я зараз буду вывозіць дровы, бо за іх можна атрымаць прэмію прамтаварамі—так адказвае дырэктар Асіповіцкага леспрамгасу на пытаньне аб становішчы дастаўкі камбінату сыравіны.

Бабруйскі леспрамгас праявіў злачынпасьць, дапусьціўшы скарыстаньне двох дзялянак вольхі на дровы, якія павінны быць скарыстаны на выраб фанэры.

Намесьнік дырэктара Бабруйскага леспрамгасу Капулін, на якога ўскладзена адказнасьць за дастаўку сыравіны камбінату, шукае розныя «аб'ектыўныя» прычыны, ня прымае ніякіх мер да арганізацыі работы, да вярбоўкі рабочых і ўвядзеньня зьдзельшчыны.

Жлобінскі чыгуначны раён яўна ігнаруе забясьпечаньне камбінату сыравінай. На працягу доўгага часу на чыгунцы ляжыць 300 вагонаў вяк парэзнай сыравіны і кіраўніцтва Жлобінскага чыгуначнага раёну зрывае дастаўку гэтай сыравіны непадачай вагонаў. Гэта ставіць камбінат у надзвычайна цяжкія ўмовы работы.

У самыя бліжэйшыя дні ў забясьпечаньні сыравінай дамагчыся рашучага пералому. Зрыўшчыкаў забясьпечаньня прыцягнуць да суровай адказнасьці.

А. Д., С. К.

Сталы калгасны абоз па вывазцы лёну.

Лесавывазка пад пагрозай

Жамойскі прарабскі вучастак па рас працоўцы экспартнага лесаматар'ялу зьяўляецца буйнейшым вучасткам у Бягомльскім леспрамгасе. Аднак, лесавывазка на гэтым вучастку праходзіць марудна. На сёньняшні дзень на прыстанёх вучастку ёсьць усяго каля 300 куб. мэтр. дзелавой драўніны.

Прадстаўнікі і адміністрацыя займаюцца толькі таварыльняй, а рашаючых мер да ліквідацыі прарыву ня прымаюць. Калгас «12-годзьдзе Кастрычніка», Бярозкаўскага сельсавету, мае 100 коняй, але лесаматар'ял возяць з перабоямі 6 падвод. Калгас «Новы Луч», Аміпцаўскага сельсавету, заключыў умову на 25 коняй, а дае толькі 9.

Калгасы Асаўокага сельсавету, Бягомльскага раёну, зусім ня возяць лесу і, ня гледзячы на такое становішча, сельсаветы і праўленьні калгасу ніякіх мер ня прымаюць.

Інструктар трэсту Ляхоўскі ўвесь час сядзіць на вучастку. Але ён нічога не зрабіў.

Замест выкананьня плянаў, вучасткі, а асабліва Мсьціскі і Жамойскі, адзін аднаму зрываюць працу. Дзесятнік - тэхнік Мсьціскага вучастку Хапяноў, якога некалькі разоў вычышчалі з апарату, зрывае лесавывазку Жамойскага вучастку.

Расплаты за вывазку па вучастку яшчэ ня было.

Забесьпячэньне як лесарубаў, а так сама і возчыкаў леспрамгасу вдзе зусім нездавальняюча.

Свой.

Патрэбен пералом

КЛІМАВІЧЫ (наш кар.). Прарывы ў лесавывазцы па Клімавіцкім раёне яшчэ не ліквідаваны. Апошняя пяцідзёнка дала зусім малы эрух. Плян вывакан па вывазцы дроў 51,3 проц., на будматар'ялах толькі на 26,3 проц.

На радзе месц (Мілаславічы, Пуцімель, Галічы) калгасы ня выконваюць заключаныя дагаворы па вывазцы.

Нерацыянальна скарыстоўваецца цягавая сіла. Добрая дарога і спрыяючае надвор'е не скарыстоўваецца для пасьпяховага выкананьня плянаў лесавывазкі.

У бліжэйшыя дні ў Клімавіцкім раёне патрэбна зрабіць рашучы пералом. Апошняя дэкада лютага вырашае пось пех вывазкі лесу. І гэта абавязвае ўсе раённыя арганізацыі, партыйныя ячэйкі і сельсаветы на месцах узмацніць работу па вывазцы.

П. Кавалёў.

Спыніць разгул хуліганаў і п'яніц

Па Лоеўскім леспрамгасе на 1932 год выначана загатовіць 10.000 к. м. дроў. Для выкананьня гэтага заданьня хапіла-б трох брыгадзіраў і аднаго тэхніка. Між тым, дырэктар леспрамгасу Лагуцік трымае тры тэхнікі і 15 брыгадзіраў (акрамя трох тэхнікаў па лясной гаспадарцы). Акрамя таго, у штаце шмат «замерщыкаў», «кубяцільшчыкаў», «вартаўнікоў». Наогул увесь наяўны тэхнічны апарат на лесазагатоўках змог бы нават без лесарубаў выканаць памянёнае заданьне за паўтара месяцы.

У чым заключаецца «дзейнасьць» апаратчыкаў? Па надбайнасьці тэхніка леспрамгасу пагніло пры Астроўскім вучастку шмат сена і саломы, за сталося шмат нескошанай сенажаці, прастой пад нагрузкай барж на 6-10 дзён і інш.

Дырэктар Лагуцік без дазволу трасту ўзяў для пракорму сваёй улас най каровы 100 пуд. дзяржаўнага сена, даў тэхніку Карпаву 150 пуд. і тэхніку Астрэйка—120 пуд. У гэты-ж час астачу сена трэба было перадаць дзяржаўным установам. Дзяржаўныя коні скарыстоўваюцца для ўласных патрэб тэхнікамі Селячавым, Астрэйка, Карпавым і інш. Тэхнік Астрэйка п'яніца і хуліган на калядныя сьвяты напіўся і хуліганіў і зьбіў у Астроўскім вучастку дзесятніка Гурскага.

Прыёмшчык Зубчынскі—арганізатар п'янак і чалавек з цёмным мінулым, пры вывазцы лесаматар'ялу перпісвае лішнія кілёматры для возчыкаў.

Самакрытыкай у Астроўскім вучастку не займаюцца. Насьценгазэта, якая два гады выходзіла рэгулярна, спынілася сваю дзейнасьць, бо арганізатара яе, адказнага рэдактара, выжылі з апарату душыцелі самакрытыкі Сеняноў і Астрэйка, а члены рэдкалегіі, якія там засталіся, баяцца выпускаць насьценгазэту, каб і з імі ня здарылася таго, што з рэдактарам насьценгазэты.

У апараце Лоеўскага леспрамгасу ёсьць і былыя папы, бандыты і іншы шкодны элемэнт.

Аб усіх гэтых недарэчнасьцях у апараце Лоеўскага леспрамгасу і Астроўскім вучастку добра ведае дырэктар Лагуцік, але ня прымае ніякіх мер.

Слова за РСІ, за пракуратурай.

Перац.

На нарадзе у рэдакцыі „С Б."

ПАПЯРЭДЗІЦЬ УСЯКІЯ СПРОБЫ

схавацца за сьпінай „аб'ектыўных" умоў

ЗАВОД МАТАР'ЯЛЫ АТРЫМАЕ

Адбылася нарада, скліканая рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь», на пытаньні забясьпечаньня матар'ялямі вагона-будаўнічага заводу імя Ланцуцкага (Гомель). Нарада дала магчымасьць высьвятліць два вельмі значныя бакі справы з забясьпечаньнем заводу матар'ялямі. З аднаго боку—работу тых арганізацый, якія завод забясьпечваюць, якія праводзяць плянаваньне гэтага забясьпечаньня. З другога боку—пастаноўку работы па самім заводзе імя Ланцуцкага ў сэнсе стварэньня сталай матар'ялавай базы, якая забясьпечвала-б бесьперабойную работу.

ВАГОНЫ ЗАВЕДЗЕНЫ Ў ТУПІКІ

Зборачны цэх заводу імя Ланцуцкага па транфінпляне на першы квартал павінен выпусьціць з капітальнага рамонту паравозы першай клясы, другой, трэцяй і чацьвертай.

Якое-ж выкананьне гэтага кварталь нага заданьня? За 1 квартал па заводзе выпуск паравозаў з рамонту першай клясы складае 100 проц. выкананьне праграмы. Па другой клясе—25 проц. праграмы. Па трэцяй клясе—12 проц., па чацьвертай клясе—38 проц.

Як відаць з паданых тут лічбаў, выкананьне праграмы заводам нязначнае, асабліва па паравозах ніжэйшых клясаў.

Адной з прычын такога невыкананьня, як гэта давялося высьвятліць на нарадзе, зьяўляецца адсутнасьць высокагатунковага жалеза, патрэбнага для вырабу адказных частак і дэталяў паравоза.

Такі-ж малюнак, як і з паравозамі, калі ня горшы, можна пабачыць і па вагонным цэху. Выпуск пантонных вагонаў у адносінах да плянавага заданьня складае 71 проц. Досыць сказаць, што на працягу вельмі значнага часу 33 вагоны, гатовыя да выпуску, заведзены ў тупікі з-за адсутнасьці абшывачнага і дахавага жалеза і, нарэшце, з-за адсутнасьці вакон нага шкла. Вагонамі загружаны заводзкі двор і гэта перашкаджае распачынаньню новых вагона-будаўнічых работ.

ЗАВОДУ—МАТАР'ЯЛЫ!

Такія факты досыць характарныя, каб сказаць, што падобнае становішча на заводзе, пры вялізарным значэньні транспарту, які заводам абслугоўваецца, зьяўляецца зусім недапушчальным і што перабоі ў забясьпечаньні заводу матар'ялямі адзначаюць па-сутнасьці зрыў транфінпляну, зрыў зімовых паравозак па чыгунцы.

Пад такім кутом погляду разглядала гэта пытаньне нарада, скліканая газэтай «Савецкая Беларусь».

Становішча заводу імя Ланцуцкага ўсугублялася яшчэ адным вельмі значным фактам. У даным выпадку гутарка ідзе аб дырэкцыі Заходніх чыгунак, якая да 1 студзеня гэтага году забясьпечвала завод матар'ялямі. З пераходам заводу ў веданьне ВОРЗ'у (Усесаюзнае аб'яднаньне рамонтных заводаў), дырэкцыя Заходніх чыгунак датэрмінова спыніла забясьпячэньне заводу матар'ялямі і да пачатку новага гаспадарчага году, замест матар'ялаў, прыслала на завод кіпу анулёваных нарадаў. Завод імя Ланцуцкага пачаў, такім чынам, сваю работу ў наступным (гэтым) гаспадарчым годзе без нармальнага фонду будаўнічых матар'ялаў.

Трэба падкрэсьліць і тое, што пераход на забясьпечаньне Стальзбыту не палепшыў становішча. Стальзбыт ня ўлічыў выключнага становішча заводу, з якім ён прыйшоў у новы гаспадарчы год.

ЗАЯВА тав. САЙКОЎСКАГА.

Кіраўнік беларускай канторы Стальзбыту тав. Сайкоўскі, выступіўшы на нарадзе, зусім шчыра прызнаў ся ў тым, што ў ранейшым работа Стальзбыту па забясьпечаньні заводу імя Ланцуцкага была недастатковай. Ня мог-жа ён апраўдаць чым-небудзь паўтарамесячны перарыў у забясьпечаньні заводу, калі з усіх даных заявак на матар'ялы ні адна ня была задаволена.

Зусім слушная заўвага тав. Сайкоўскага і аб тым, што завод імя Ланцуцкага да гэтага часу дае ў сваіх нарадах вельмі дробную і разнастайную спэцыфікацыю па паасобных відах сталі, пры тым, у нязначных колькасьцях. Гэта, з аднаго боку, затрудняе пракатку на заводах і парушае, з другога боку, выкананьне гэтых заказаў.

ЧЫМ АБАВЯЗАНЫ ЗАВОД?

Да чаго-ж зводзілася патрабаваньне кіраўніка Стальзбыту, з якім цалкам згадзіўся і прадстаўнік ад заводу імя Ланцуцкага? Гэтыя патрабаваньні зводзіліся да тых прапаноў, якія ўжо былі выказаны газэтай «Савецкая Беларусь»:

«Завод павінен поўнасьцю вызваліцца ад імпартных гатункаў. Практына хоць-бы вагона-будаўніча га Рослаўльскага заводу (Заходняя вобласьць) паказала гэтую маг чымасьць. Зьмяніўшы марачныя гатункі на гандлёвыя, Рослаўльскі завод дае для транспарту тамія ва гоны, якія ніяк ня горш за вагоны заводу імя Ланцуцнага».

«Завод ні ў якім разе не павінен ужываць марачныя гатункі жалеза для вырабу такіх частак, якія можна лёгка вырабіць з гандлёвага жалеза. На завод прывозілася марачнае шахматнае жалеза і там скарыстоўвалася для вырабу праходняў паміж вагонамі. І гэта ў той час, калі на праходні зусім лёгка можна скарыстоўваць жалеза гандлёвага гатунку, зрабіўшы на ім адпаведныя касечкі».

«На заводзе зараз-жа павінна разгарнуцца хваля вынаходніцтва і рацыяналізацыі ў галіне замены марачных гатункаў на гандлёвыя, у галіне выпрацоўкі сталага стандарту ў матар'ялах».

Да гэтага зводзіліся зусім слушныя патрабаваньні кіраўніка беларускай канторы Стальзбыту.

Зусім невыпадкова перад нарадай паўстала яшчэ адно пытаньне. Гэтакарэнная рэканструкцыя работы Стальзбыту, стварэньне пры беларускай канторы самастойнай матар'ялавай базы. Неабходнасьць гэтага мерапрыемства прынцыпова вырашана ва ўсіх адпаведных арганізацыях. Але зараз ідуць «спрэчкі» аб тым, дзе будаваць базу: у Гомелі, альбо ў Бранску. Цяганіна з вырашэньнем гэтага пытаньня пасутнасьці тармозіць бесьперабойнае забясьпечаньне ня толькі заводу імя Ланцуцкага, але і астатніх мэталяапрацоўчых заводаў БССР і Заходняй вобласьці.

«УСЁ ГЭТА Я ПЕРАДАМ НАЧАЛЬСТВУ».

33 вагоны, якія павінны быць ужо ў саставах і рухацца па шляхах; 33 вагоны, якія загружаюць двор заводу імя Ланцуцкага, стаяць без вакон нага шкла толькі па віне Белдзяржснабу.

Што-ж здарылася? Белдзяржснаб і да гэтага часу не заключыў нават дагавор з заводам на пастаўку матар'ялаў і навязвае яму незаконнае патрабаваньне пры заключэньні дагавору аб 10 процантах зваротных сродкаў.

Белдзяржснаб гэтым проста парушыў урадавую пастанову і ілюструе сваё наведаньне новых асноў крэдыт най сыстэмы.

Дапаўненьнем да ўсяго гэтага і ілюстрацыі такіх адносін Белдзяржснабу да заводу імя Ланцуцкага было і тое, што на нараду Белдзяржснаб прыслаў прадстаўніка, ня здолеўшага сказаць ніводнага слова аб матар'ялах для заводу. Адзінае, што мог сказаць белдзяржснабаўскі прадстаўнік, заключалася ў наступнай рэпліцы:

— Усё гэта я перадам начальству.

Нарада катэгарычна патрабавала ад Белдзяржснабу больш істотнага ставу да патрэб заводу імя Ланцуцкага. 33 вагоны не павінны затрымлівацца на віне гэтай арганізацыі. 33 вагоны павінны быць зараз-жа аднклёнымі.

НЕ ХАВАЦЦА ЗА «АБ'ЕКТЫЎКАЙ»

Якія-ж практычныя вынікі дала нарада?

У нас няма падстаў сумнявацца ў тым, што зробленая заява кіраўніком Стальзбыту аб асобым пагляде, пад які бяруцца завод імя Ланцуцкага, з прычыны яго выключнага становішча, не застанецца голай фразай.

У гэты-ж вечар, пасьля нарады на ўсе заводы—пастаўшчыкі матар'ялаў, былі пасланы прадстаўнікі, якім даручана дамагацца фарсаванай высылкі матар'ялаў для заводу.

Прадстаўнік заводу імя Ланцуцкага запэўніў нараду, што завод, які яго паслаў, разгорне работу па ўзьняцьці новай хвалі вынаходніцтва і рацыяналізацыі ў галіне замены імпартных гатункаў на гандлёвыя, у галіне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Дэпутацкая група, якая ўзьняла пытаньне аб забясьпечаньні заводу матар'ялямі, разгорне яшчэ большую работу і непаслабны кантроль над матар'ялавым забясьпечаньнем вытворчасьці.

Перад партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі і гаспадарнікамі заводу стаіць адказная задача ўзначаліць вынаходніцкі і рацыяналізатарскі рух на заводзе, задача мабілізацыі ўсіх унутраных магчымасьцяй працырыемства для ўзмацненьня яго матар'яльнай базы.

Ўсе практычныя рашэньні і прапановы нарады павінны быць праверены наколькі яны сапраўды праводзяцца ў жыцьцё, наколькі завод сапраўды ня будзе цярпець перабояў ад дрэннага забясьпечаньня, наколькі Стальзбыт і іншыя арганізацыі па забясьпечаньні выканаюць узятыя на сябе абавязкі.

Гомельская партыйная арганізацыя і партыйны калектыў заводу павінны выключыць магчымасьць растлумачваць прарывы на заводзе толькі дрэнным забясьпечаньнем яго матар'ялямі. Па ўсякіх спробах захавацца за «аб'ектыўнымі» прычынамі, па гэтых яўных апартуністычных правах—партыйная арганізацыя абавязана ўдарыць з усёй бальшавіцкай рашучасьцю.



У ПАЛІТЭХНІЧНАЙ ШКОЛЕ. Інструктар знаёміць вучняў з маторам.

Дэкаднік генэральнай праверкі

Поўнасьцю ахапіць няпісьменных вучобай

Змагаючыся за колькасьць, не забываць аб якасьці

Пад кіраўніцтвам раённай партыйнай арганізацыі Полацкі раён дасягнуў досыць значных посьпехаў у ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Яшчэ да XIV зьезду КП(б)Б у 8-мі сельсаветах з 33 Полацкага раёну ў асноўным была закончана ліквідацыя няпісьменнасьці. Зараз у раёне працуе 187 лікпунктаў, якімі ахоплена 4.065 чалавек. Значныя посьпехі дасягнуты раёнам і ў справе ліквідацыі малапісьменнасьці. Усяго ў раёне налічваецца 9.633 малапісьменных, з іх ахоплена школамі 80-85 проц.

Асаблівая ўвага кіраўнікоў ліквпунктаў зьвернута на ахоп вучобай няпісьменных і малапісьменных дапрызыўнікаў і апошнія ўсё рэгулярна наведваюць ліквпункты. 90 проц. малапісьменных дапрызыўнікаў ахоплена вучобай у школах малапісьменных.

Сакрэт колькасных перамог Полацкага раёну заключаецца ў тым, што партыйная арганізацыя своечасова мабілізавала ўвагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці шляхам шырокай разгорнутай масавай растлумачальнай работы як сярод прафсаюзаў, камсамольскіх арганізацый, так і сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Яшчэ ў верасьні 1931 году партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі правялі масавы паход па зьяўленьні і прыцягненьні няпісьменных і малапісьменных на ліквпункты. У парадку падрыхтоўкі да XIV зьезду КП(б) праведзен яшчэ раз дэкаднік штурму на культурным фронце, які даў значны пералом у гэтай рабоце.

Прэзыдыум РВК заслухаўшы справаздачу 8 сельсаветаў спэцыяльна па пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці, некаторым з іх даў цьвёрдыя тэрміны скончэньня работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Аддзел Нарасьветы прэміраваў лепшых кіраўнікоў ліквпунктаў і вучняў.

Але посьпехі яшчэ не замацаваны. Зараз наведваньне ліквпунктаў і школ малапісьменных у сярэднім даходзіць толькі да 75 проц. За час дэкадніка праверкі партыйныя і грамадзкія арганізацыі раёну паўнымі мабілізаваць увагу пралетарскіх мас на стопроцантнае наведваньне ліквпунктаў няпісьменнымі і малапісьменнымі і разгарнуць барацьбу за падвышэньне якасьці вучобы.

Семянкоў.

Хто адкажа за зрыў лікбезу?

Менскі прыгарадны саўгас імя Лекерта зьяўляецца адным з буйнейшых гаспадарак сыстэмы Белсельабяднаня. У саўгасе працуе сталых рабочых больш 154 чал. Ёсьць у саўгасе партыйная і камсамольская ячэйкі, але за ліквідацыю няпісьменнасьці яшчэ зусім ня браліся. Між тым, у саўгасе налічваецца больш 30 няпісьменных.

Старшыня рабкому і сакратар парт'ячэйкі чакаюць з гораду ліквідатараў у той час, калі ў саўгасе ёсьць больш 100 вучняў школы саўгас зучу, камсамольцы і настаўнікі. Дырэкцыя саўгасу не дае памяшканьня для ліквпунктаў. Падручнікі, набытыя яшчэ ў мінулым годзе, расьцягваюцца, ліквідатары ёсьць на месцы, ёсьць і памяшканьне, а ліквпункт не працуе.

Н.

У саўгасе „Камаровічы" па віне настаўніка Лопіча не працуе ліквпункт

У саўгасе «Камаровічы» Петрыкаўскага раёну работа па ліквідацыі няпісьменнасьці не наладжана. Для работы ў ліквпункце быў вылучан настаўнік Камаровіцкай ШКМ т. Лопіч, але ён у ім нават ніводнага разу не паказаўся.

На вытворчай нарадзе асьветнікаў на запытаньне—чым тлумачацца гэтыя адносіны да даручанай справы,—таў. Лопіч адказаў—«я ня ведаў, што будуць плаціць за ліквідацыю няпісьменнасьці». Настаўнік Лопіч, відаць, ня ведае, што асьветнікі БССР узялі на сябе абавязацельства змагацца за суцэльную пісьменнасьць.

Ліквпункт у саўгасе павінен працаваць.

Б—к.

Забясьпечыць бесьперабойную работу ліквпунктаў

Задача—ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці да 1-га мая 1932 году — была пастаўлена ў цэнтр работы партыйнай ячэйкі і грамадзкіх арганізацый Намойцянскага сельсавету, Сеньненскага раёну.

Дзякуючы мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці сельсавету на справу ліквідацыі няпісьменнасьці, Намойцянскі сельсавет ідзе ў першых радох барацьбітоў за суцэльную пісьменнасьць. Па сельсавеце працуе чатыры плянавых ліквпункты і пяць грамадзкіх, якімі ахоплена 134 няпісьменных, з агульнай колькасьці—140 чал. Падручнікамі і пісьмовымі прыладамі ўсе ліквпункты і школы малапісьменных забясьпечаны поўнасьцю і працуюць нармальна.

Аднэй з асноўных хібаў у працы па ліквідацыі няпісьменнасьці зьяўляецца ненармальнае наведваньне ліквпунктаў няпісьменнымі. На гэты адстаны вучастак у ліквідацыі няпісьменнасьці Намойцянскія грамадзкія арганізацыі павінны накіраваць усе свае сілы і ўвагу, каб тэрмінова забясьпечыць поўнае наведваньне няпісьменнымі ліквпунктаў.

Стварэньне неабходных умоў для нармальнага і бесьперабойнага ходу заняткаў ліквпунктаў—павінна зьявіцца баявой задачай партыйнай і камсамольскай ячэек.

Намойцянскі сельсавет мае ўсе магчымасьці ў бліжэйшы час дабіцца карэннага пералому ў рабоце ліквпунктаў і да 1-га мая 1932 году прысьці суцэльна - пісьменным.

Б. Зяневіч.

Бібліяграфія

Кніжка, якую трэба неадкладна ізьяць

М. А. ТАРАСАЎ „Лён" ДВС. Менск 1932 г.

Пастанова ЦК УсеКП(б) па выдавецкай рабоце з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што характар і зьмест кнігі павінны цалкам адпавядаць задачам сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі.

«Кніга павінна быць баявой, і актуальна-палітычнай, яна павінна ўзброіць шырачэйшыя масы будаўнікоў сацыялізму марксыцка-ленінскай тэорыяй і тэхнічна-вытворчымі зедамі»—вось, што гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б) па рыдавецкай рабоце.

Гэту важнейшую дырэктыву партыі, як відаць ня зусім добра ўсвоілі тыя работнікі, якія зрабілі недапушчальную памылку, выдаўшы ў 1932 годзе палітычна-шкодную кніжку Тарасава «Лён».

Гэта брашура новая толькі годам выданьня, а па сваім зьмесьце яна зусім не адрозьніваецца ад старых шаблённых брашур па ільнаводзтву, разьлічаных на індывідуальныя гаспадаркі, якія аўтар падае пад шыльдай «ільняр», «спрактыкаваны гаспадар» і г. д.

Ніводнага слова ў гэтай кніжцы не гаворыцца аб сацыялістычнай рэканструкцыі ільнаводзтва. Словы «ільнаводныя саўгасы і калгасы» амаль што зусім не сустракаюцца ў гэтай брашуры. Як відаць, гэтыя словы аўтару ня зусім падабаюцца. Яму больш падабаецца «спрактыкаваны гаспадар» (чытай—кулацкая гаспадарка).

Аўтар знаходзіць месца у сваёй брашуры для гістарычнага нарысу ільнаводзтва, для апісаньня паходжаньня лёну і г. д. і зусім не знаходзіць месца для дырэктыў партыі і ўраду аб шляхох вырашэньня праблемы тэх культур.

У разьдзеле «Для чаго культывіруецца лён у СССР» аўтар лічыць нават не патрэбным падкрэсьліць значэньне лёну, як сыравінай базы для сацыялістычнай прамысловасьці і таксама, як прадукту для экспарту.

У главе «Мерапрыемствы па ільнярэтоўу» аўтар дае палітычна-школьныя, няпісьменныя азначэньні кантрактацыі і МТС.

Аўтар кажа, «кантрактацыя—шлях да калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ліквідацыі кулацтва як клясы» (стар. 4). Тое, што кантрактацыя садзейнічае калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак—гэта, бязумоўна, правільна, але вось вельмі блытаным і няправільным зьяўляецца трактоўка аўтара, што кантрактацыя ёсьць шлях да ліквідацыі кулацтва, як клясы. Кожны піянэр можа растлумачыць аўтару, што ліквідацыя кулацтва, як клясы, праходзіць у нас на аснове суцэльнай калектывізацыі, а не на аснове кантрактацыі, як аб гэтым трактуе аўтар. Далей аўтар кажа, што «Кантрактацыя мае мэтаю пашырэньне засеўных плошчаў, шляхам разворваньня новых зямель, падвышэньне ўраджайнасьці праз увядзеньне агра-мінімуму» (стар 5) і вось гэтым аўтар аб межуўвае ўсё значэньне кантрактацыі.

У вызначэньні ролі МТС аўтар выходзіць з правааапартуністычных пазыцый, кажучы, што «МТС зьяўляецца цэнтрам, у якім трупуецца ўся мэханічная цяга, необходная для абслугоўваньня вытворчых патрэб аб'яднаных калгасаў» (5 стар.).

Паводле аўтара выходзіць, што МТС ёсьць толькі сукупнасьць трактароў, ёсьць толькі энэргетычны цэнтр, у задачу якога ўваходзіць «абслугоўваньне вытворчых патрэб аб'яднаных калгасаў».

Гэтая знаёмая песенька правых-апартуністаў, якія фактычна зводзяць ролю МТС да пракатнага пункту, толькі «абслугоўваючага», а не пераробляючага вёску на сацыялістычны лад.

Сапраўды-ж у МТС мы маем форму арганізацыі буйнай калектыўнай сельскай гаспадаркі на высокай тэхнічнай базе.

Аўтар-жа ніводнага слова ня кажа аб ролі і значэньні МТС як арганізатара калгаснай вытворчасьці, аб ролі і значэньні МТС у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пастаўленая партыяй і ўрадам задача спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі зусім не знаходзіць ніякага адбітку ў гэтай кніжцы.

Аўтар кажа, што лён сеюць у БССР больш за ўсё ў паўночных раёнах, і што: «гэта тлумачыцца натуральна-гістарычнымі і глебавымі ўмовамі» (стар. 4).

Такім чынам у поўнай салідарнасьці з устаноўкамі шкодніка Чэлінцава, аўтар устанаўлае прыорытэт прыродных умоў над плянам, над народна-гаспадарчымі запатрабаваньнямі.

На стар. 16 аўтар кажа: «Вузка спэцыялізаванай гаспадаркі арганізоўваць нязарта». Абсалютная няпісьменнасьць гэтай устаноўкі аўтара відавочна. Наадварот, для кожнага з нас зусім бясспрэчным зьяўляецца тое палажэньне, што, найбольш дасканалая арганізацыя вытворчасьці патрабуе найбольш вузкай спэцыялізацыі гаспадаркі, эразумела, абясьпечваючы пры гэтым рацыянальнае скарыстаньне ўсіх адыходаў вытворчасьці. А што аўтар разумее пад «вузкаспэцыялізаванай гаспадаркай»? А чаму ня варта арганізоўваць такія гаспадаркі? Аб гэтым ніводнага слова не гаворыцца. Гэта, як відаць, сакрэт аўтара. Зусім зразумела, што наступная пастаноўка пытаньня адпавядала ад поўнай сацыяльнай формы гаспадаркі, у поўны пэрыяд часу і адпаведным ім узроўні тэхнікі і арганізацыі працы, зьяўляецца груба-памылковай.

На ст. 14 аўтар фактычна працягвае старую зьбіўную трактоўку шкоднікаў тыпу Чаянава аб тым, што «не рэкамэндуецца сеяць лён па лёне, ці паўтараць пасеў яго ў бліжэйшыя гады» і далей аўтар кажа «спрактыкаваныя ільняры практычным шляхам асвоілі гэта і сеялі лён не раней, як праз 6 гадоў» і ў сувязі з гэтым аўтар падае «распрацаваныя адпаведныя севазвароты», г. зн. традыцыйныя севазвароты, разьлічаныя на індывідуальныя гаспадаркі з 11—16 проц. лёну і 16—25 проц. папару. Праўда, на наступнай старонцы аўтар сам прызнае, што для буйных спэцыялізаваных гаспадарак рэкамэндаваныя севазвароты ня могуць быць прыняты, а таму ён падае ўшчыльненыя ільняныя севазвароты з 40 і вышэй процантаў ушчыльненьня лёну: Але, калі прааналізаваць гэтыя севазвароты, то можна прыйсьці да выводу, што яны паданы з тэндэнцыёзнай мэтаю скампрамэтаваць у вачох шырокіх мас калгасьнікаў і таксама агратэхнічных працаўнікоў самую магчымасьць пабудовы ўшчыльненых ільняных севазваротаў, так як паданыя аўтарам ушчыльненыя ільняныя севазвароты па сваім складзе і суадносінах культур зусім не адбываюць у сябе плянавыя заданьні на адпаведных вытворчых тыпах спэцыялізаваных калгасаў і акрамя таго на даным этапе пры тым узроўні тэхнікі, які мы будзем мець у бліжэйшыя гады, яны зьяўляюцца навытрымаўнымі з тэхнічнага боку.

Аўтар, як відаць, зусім сьвядома робіць скачок эразу з севазваротаў з 11—16 проц. лёну да «архі-левацкіх» (на даным этапе) севазваротаў і 40—100 проц. ушчыльненыя ільна-і канапелі, зусім упускаючы севазвароты з 25—33 проц. лёну, якія на даным этапе павінны зьявіцца найбольш масавымі для спэцыялізаваных ільняных калгасаў у адпаведнасьці з запатрабаваньнямі плянавага заданьня для дадзенага вытворчага тыпу.

Магчымасьць ушчыльненьня лёну ў севазвароце да 25—33 проц. нават да 40 проц. усё бясспрэчна даведзена навукова-дасьледчымі установамі Саюзу і ўжо фактычна ў масавым парадку рэалізуецца ў саўгасах і калгасах шляхам практыкаваньня засеваў лёну 2 гады падрэд па канюшыніну і шляхам дапушчэньня перапынку паміж пасевамі лёну ў 4 гады. Аб гэтым аўтар ні слова ня кажа.

Пры выкладаньні агратэхнічных прыёмаў аўтар відае ня выходзіць за межы індывідуальнай гаспадаркі. Аспаўоўваму пытаньню будаўніцтва саўгасаў і калгасаў—мэханізацыі ў брашуры зусім не надаецца ніякай увагі. Зусім ігнаруецца задача мэханізацыі подкі, цераблення, ачосваньня гальвак і першачнай апрацоўкі лёну. Спы ляючыся падрабязна на ручной уборцы лёну, аўтар абмежоўваецца наступнымі двума-трыма сказамі аб уборцы лёну церабілкаю: «У апошні час уборку лёну пачынаюць рабіць машынамі. З машын, якія ёсьць у нас у СССР—гэта церабільная машына «Сунгена». На гэтай машыне можна ўбраць да 2-х га лёну за 10-падзённы рабочы дзень. Вакзыць машына «Сунгена» 850 клгр. Цягавай сілай зьяўляецца трактар» (стар. 51)—вось усё, што аўтар палічыў патрэбным сказаць аб мэханізацыі ўборкі лёну. Зразумела, што гнакш, як ігнараваньне мэханізацыі ўборкі лёну,—гэта назвать нельга.

Цікава таксама адзначыць, што аўтар на стар. 50 кажа, што на цераблёньне 1 га лёну патрэбна 15—35 дзён—гэта ў той час, калі па прыкладных нормах зьпрацоўкі, зацьверджаных Калгасцэнтрам БССР, прадуглед жваецца ўсяго 12 дзён.

У главе «Спосабы абмалоту лёну» аўтар знаходзіць месца для апісаньня прымітыўнай індывідуальнай гаспадаркі для аддзяленьня галовак лёну (драчкі і грабіні) і зусім ня спыняецца на машыне Гільштэйна па ачэсваньні галовак лёну. «За апошні год у нас вынайдзена рабочым Гільштэйнам машына для аддзяленьня галовак» (стар. 53)—вось літаральна тыя некалькі слоў, якія магчыма знайсьці ў гэтай брашуры аб машыне т. Гільштэйна—той машыне, якая ўжо ў 1931 годзе дала магчымасьць у давалі значных разьмерах мэханізаваць працэс ачэсваньня галовак лёну.

У брашуры можна знайсьці малюнкі дракчоў, грабянёў і г. д., але дарэм ны будуць вашы пошукі: ды ня зной дзеце ў гэтай брашуры малюнкаў льнаперабілкі «Камсамолка», машыны т. Гільштэйна і г. д.

Усё гэта падкрэсьлівае, што даная брашура фактычна разьлічана на індывідуальную гаспадарку, але не на ільнаводныя саўгасы і калгасы.

Апрача ўсяго гэтага ў брашуры ёсьць цэлы рад сур'ёзных памылак і чыста-тэхнічнага парадку, якія сьведчаць і аб тэхнічнай няпісьменнасьці зьместу гэтай брашуры. Так, на стар. 20 аўтар кажа: «сярод угнаеньняў адрозьніваюцца а) галоўнае ўгнаеньне (гной, зялёнае ўгнаеньне), б) няпоўнае—гэта мінэральнае ўгнаеньне». Ня пісьменнасьць гэтай клясыфікацыі ўгнаеньняў відавочна.

У главе «Выраб глебы» (стар. 17-19) аўтар дае вельмі няясна, а месцамі і няверна, апісаньне апрацоўкі глебы пад лён. Так, аўтар кажа: «граніч ная глыбіні ўзворваньня—яма, чым глыбей, тым лепш» і далей,—«Калі не праведзена восеньскае ўзворваньне, поле патрэбна ўзарць увясну загадзя на глыбіню 65—74 см.»!

Марксысцка-ленінскае выхаваньне новага папаўненьня — на вышэйшую ступень

Усім ГК і РК (КП(б)Б

Для пасьпяховага ажыцьцяўленьня пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б па правядзеньні двухдэкадніка агляду становішча партвыхаваўчай работы з кандыдатамі і новымі членамі КП(б)Б, культпроп ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. У раёне пастановай ГК і РК КП(б)Б ствараецца аглядавая камісія ў складзе 5-7 чал.

2. Аглядавая камісія ў выкананьне дырэктыў ЦК і пастановы РК КП(б)Б арганізуе работу: а) па праверцы выкананьня дырэктыў даных раней ЦК і РК КП(б)Б па рабоце з кандыдатамі;

б) вывучэньне існуючага зараз становішча па марксысцка - ленінскім выхаваньні кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б і ўнясьненьні іх у практычную работу партарганізацый;

в) распрацоўку і ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па 100 проц. ўцягненьні іх у сыстэму партасьветы кандыдатаў і новых членаў партыі і арганізацыі іх практычнай работы.

3. Для правядзеньня работы па аглядзе неабходна ў распараджэньне аглядавай камісіі вылучыць брыгаду таварышоў з партактыву, разьмеркаваць вучасткі работы ў брыгадзе, кіруючы іх работай у працэсе агляду.

4. Цэнтральным і раённым газэтам забясьпечыць сыстэматычную з дня ў дзень падборку па пытаньнях агляду арганізаваўшы для гэтай работы брыгады рабселькораў.

5. Для выкананьня настаўленых перад двухдэкаднікам агляду задач арганізаваць работу наступным чынам:

а) абгаварыць задачы дэкадніка па бюро РК КП(б)Б і на сходах партячэек з паняпрэляй праверкай выкананьня даных раней дырэктыў па рабоце з кандыдатамі;

б) вывучыць склад кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б (прыёму 1931 г.) у партарганізацыях на месцы іх вытворчасьці (дзе працуе, як выконвае работу) падрыхтаванасьць агульнай і палітычнай нагрузкі, якую зараз выконвае.

Адначасова праверыць, дзе і як вучыцца, як спраўляецца з партнагрузкай, якія мерапрыемствы праводзілі ячэйкі па дапамозе як у вучобе, так і ў выкананьні нагрузкі;

в) якія формы партвучобы (кандыд. школы, гурткі па падрыхтоўцы ў партыю і інш.) скарыстоўваюцца для партвыхаваньня кандыдатаў, як забясьпечан вытворчы прынцып арганізацыі школ і гурткоў, забясьпечанасьць іх прапагандыстамі і падрыхтаванасьць апошніх; як партшколы дапамагаюць у выкананьні нагрузкі кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б; чаму ня ўсе кандыдаты ахоплены вучобай (высьвятленьне канкрэтных прычын зрыву вучобы кандыдатаў);

г) распрацоўка мерапрыемстваў па наладжаньні работы з кандыдатамі на вінна правадзіцца з шырокім удзелам апошніх, для чаго скарыстаць нарады кандыдатаў, сходы іх з абгаварэньнем існуючага становішча па рабоце сярод новых папаўненьняў і абгаварэньня мерапрыемстваў па наладжаньні гэтай работы;

д) для паляпшэньня якасьці работы з кандыдатамі правесьці нарады прапагандыстаў, працуючых з апошнімі, прыцягнуўшы на нарады сакратароў ячэек КП(б)Б. На нарадах абгаварыць мерапрыемствы па наладжаньні работы з кандыдатамі як у галіне марксысцка - ленінскага выхаваньня, так і партнагрузкі. Вылучыць дадаткова з партактыву больш падрыхтаваных таварышоў для работы з кандыдатамі. Дадаткова арганізаваць сетку кандыдацкіх школ і гурткоў. Асобна распрацаваць плянавыя меркаваньні па марксысцка - ленінскім выхаваньні кандыдатаў і беспартыйнага актыву, які рыхтуецца ў партыю;

е) асобную ўвагу пры правядзеньні агляду зьвярнуць на выяўленьне становішча агульнай пісьменнасьці кандыдатаў і новых членаў КП(б)Б, арганізаваць работу па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці апошніх.

6. Вынікі агляду прапрацаваць на пасяджэньні бюро РК КП(б)Б і з пастановай апошняга дасласць у культпроп ЦК КП(б)Б.

7. Арганізаваць асобна пры райпартгабінэтах сыстэматычную кансультацыю для прапагандыстаў і сакратароў ячэек КП(б)Б як па лініі партасьветы, так і па лініі практычнай работы кандыдатаў, таксама канцэнтруючы вопыт работы ў гэтай галіне.

Нам. заг. культпропам ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

Заг. сэктарам прапаганды культпропу ЦК КП(б)Б РАМАНЧУК.

Прэміі за лепшыя паказьнікі работы па конкурсе „Правды“

Пастанова Цэнтральнай Конкурснай Камісіі

XIV зьезд КП(б)Б пастанавіў:

«Устанавіць пераходныя сьцягі ад XIV зьезду КП(б)Б для ўзорных у справе правядзеньня конкурсу «Правды» ячэек, райкомаў партыі і рэдакцый газэт (цэнтральных, раённых і нізавых) за лепшую арганізацыю работы па ўмацаваньні калгасаў, укараненьні ў калгасна-саўгасную вытворчасьць 6-ці умоў тав. Сталіна, па барацьбе з абязьлічкай, ураўнілаўкай і разгорнутую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі, поўнае выкананьне ўсіх загатовак і т. д.».

Дамагацца лепшых вынікаў у рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, змагацца за сьцяг імя XIV зьезду КП(б)Б—пачэсная і адказная работа.

Цэнтральная конкурсная камісія пры «Зьвязьдзе» на кіраўніцтве абвешчаным «Правдой» конкурсам нізавых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў устанавіла за лепшую работу па конкурсе—за дасягненьні лепшых рэзультатаў у арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў наступныя прэміі:

1. Раённым газэтам.

1 пераходны сьцяг імя газэты «Зьвязда»—права на першачарговае атрыманьне дружарні для адной раённай газэты, 5 шклографаў, 3 месцы ў вытворчай экскурсіі (Масква—Сталінград—Харкаў—саўгас «Гігант»), 3 велёсыпеды, 1 месца ў доме адпачынку, 1 месца на курорт (дом адпачынку альбо санаторы), 2 фота-апараты.

2. Райналгассаюзам, праўленьням калгасаў і дырэкцыям саўгасаў і МТС.

1 месца ў дом адпачынку, 3 шклографы, 2 месца ў вытворчай экскурсіі (Масква-Сталінград-Харкаў-саўгас Гігант»), тэлефанізацыя трох праўленьняў калгасаў.

3. Рэдкалегіям шматтыражных і насьценных газэт калгасаў, саўгасаў і МТС.

1 пераходны сьцяг імя газэты «Райселькор», 1 пераходны сьцяг імя газэты «Калгаснік Беларусі», 17 шклографаў, 12 месц у вытворчай экскурсіі (Масква-Сталінград-Харкаў-саўгас «Гігант»), тэлефанізацыя рэдакцыі 2-х шматтыражных і насьценных газэт, 10 бібліятэчак на суму 100 руб. кожная, 2 месцы ў дом адпачынку, 1 месца на курорце (дом адпачынку, або санаторы), 4 фота-апараты, 2 велёсыпеды.

Рэдкалегіям фабрычна-заводзкіх газэт.

1 пераходны сьцяг імя газэты «Рабочий», 5 шклографаў, 3 месца у вытворчай экскурсіі (Масква-Сталінград-Харкаў-саўгас «Гігант»), 1 месца ў доме адпачынку, 1 месца на курорце (дом адпачынку, або санаторы), 1 фота-апарат.

Дамагайцеся лепшых паказьнікаў! Змагайцеся за сацыялістычнае пярэдзянства!

Цэнтральная конкурсная камісія пры «Зьвязьдзе».

Пяцідзесьнік стварэньня насенных фондаў

МАГІЛЕЎ, (21-II наш кар.). Магілеўскі райком партыі сёньня абвясьціў 5-цідзёсьнік масавага паходу за збор насеньня. У раёне паслана звыш 500 брыгадзіраў для рэалізацыі дырэктыў партыі і ўлады аб стварэньні насенных фондаў.

Рэдакцыя газэты «Камунар Магілеўшчыны» пасылае выездную рэдакцыю, апорным пунктам якой будзе ВЕНДАРАРСКІ сельсавет.

СЯНКЕВІЧ.

Пра рэарганізацыю загатоўчага апарату

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

У адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР за 13 лютага 1932 г. № 137 «Пра рэарганізацыю загатоўчага апарату» (Известия ЦИК СССР и ВЦИК» № 44 за 14-II—32 г) СНК БССР пастанаўляе:

1. Утварыць пры СНК БССР пасаду Упаўнаважанага Камітэту па загатоўках пры Савеце Працы і Абароны, усклаўшы на яго рэгуляваньне і агульнае кіраваньне ўсімі загатоўкамі ў БССР.

2. Усе апэрацыі па загатоўках збожжа-фуражных культур, лёну, пянькі і маслясемя ў БССР Упаўнаважаны Камітэту па загатоўках ажыцьцяўляе праз непасрэдна яму падпарадкаваныя канторы агульнасаюзных загатоўчых арганізацый «Заготзярно» і «Заготлён».

Апэрацыйнае кіраваньне загатоўкамі іншых прадуктаў ускласьці на адпаведныя народныя камісарыяты і Белкалгасаюз, якія павінны праводзіць загатоўкі па плянах і дырэктывах Упаўнаважанага Камітэту па загатоўках.

3. Даручыць Упаўнаважанаму Камітэту па загатоўках з прыцягненьнем Народнага Камісарыяту Снабжэньня, ВСНГ, Народнага Камісарыяту Земляробства, Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежнага Гандлю і Белкалгасаюзу не позьней 25 лютага рэарганізаваць загатоўчы апарат у БССР у адпаведнасьці з паказаньнямі вышэй пастановаю СНК СССР.

4. Даручыць Упаўнаважанаму Камітэту па загатоўках устанавіць парадак перадачы загатоўчага апарату і кадраў сельска-гаспадарчай кааперацыі адпаведным загатоўчым органам.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

19 лютага 1932 г.
г. Менск.
№ 80.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьверджаньне т. БЭНЭКА, К. Ф. Упаўнаважаным Камітэту па загатоўках пры СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зацьвердзіць Упаўнаважаным Камітэту па загатоўках пры СНК БССР тав. БЭНЭКА, К. Ф.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

19 лютага 1932 г.
г. Менск.
№ 81.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьверджаньне т. Красоўскага А. М. намесьнікам Упаўнаважанага Камітэту па загатоўках пры СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зацьвердзіць Намесьнікам Упаўнаважанага Камітэту па загатоўках пры СНК БССР тав. КРАСОЎСКАГА, А. М.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

19 лютага 1932 г.
г. Менск.
№ 82.

Арганізаваць зімовы расьціл саломы лёну

Павялічэньне таварнага выхаду ад вядучых культур калгасаў зьяўляецца важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй. Між тым, у лёна-малочных калгасах вялікая колькасьць таварнай прадукцыі ў выглядзе неапрацаванай ільнянай саломы ляжыць мёртвым грузам. Вось чаму актуальнейшым пытаньнем зьяўляецца зараз апрацоўка гэтага лёну. Паводле прыблізных падлікаў, у калгасным сэктары ад ураджаю 1931 г. засталося неапрацаваным лёна-саломы з 9,5—10 тыс. га. Гэты лён трэба разасласьць зараз, каб раньняй вясной сабраць трасту, апрацаваць яе і здаць валакно дзяржаве.

Пры расьціле саломы лёну ў зімовы пэрыяд—працэс аддзяленьня валакна ад драўніны амаль той-жа самы, што ўлетку і ўвосень. Розьніца заключаецца толькі ў сродках гэтага працэсу аддзяленьня. Ясна, што тэрмін ляжаньня саломы на сьцелішчы ўзімку зьяўляецца больш доўгім. Сам жа зімовы расьціл можна праводзіць двума спосабамі. Па сьнегу, асеўшаму пасьля цёплых дзён, і пухкаму ня глыбокаму сьнегу. Лепшым сродкам расьцілу ва ўмовах БССР зьяўляецца люты. Лепшым падвор'ем для расьцілу будзе нехалодны і ціхі, бязьветраны дзень. Асабліва пажадана скарыстаць час, калі ідзе сьнег, які затрымлівае трасту ад здуваньня пры моцных паўночна-заходніх ветрах.

Месцам для сьцелішча павінны быць вучасткі, дзе больш усяго ёсьць сьнегу і дзе ён больш усяго затрымліваецца вясной. Асаблівасьць зімы гэтага году прымушае нас удзяліць апошнім абставінам асаблівую ўвагу. Звычайна месцамі, дзе зьбіраецца вялікая колькасьць сьнегу, зьяўляюцца лясныя палямы, прысядзібныя вучасткі, выганы, канюшыньчы і сухадолы. Пры недахваце памянёных месц для расьцілу можна скарыстаць бугры, з невялікім схілам, закрытыя ад ветру, дзе менш за ўсё дзьме сьнег.

Крутыя схілы, месцы зусім не закрытыя ад ветру, дзе ведьмі мала сьнегу, не павінны быць скарыстаны для расьцілу саломы. Няпрыгодны і паўднёвыя схілы, бо тут таяньне сьнегу адбываецца хутка, траста раней часу спускаецца на зямлю, валакно ад гэтага псуецца, становіцца ломкім і траціць колер. Апрача таго, тут ёсьць вялікая небясьпека змываньня трасты пры веснавой паводцы.

Лепшым-жа месцам будзе роўная, бяз упадзін паверхня, абароненая ад моцных вятроў з вялікім роўным сьнегам. Месцы няроўныя і асабліва з восені зараныя, бязумоўна, ня прыгодны для сланьня, бо ў лагчынках увесну зьбіраецца вада, на пахаці валакно брудзіцца і псуецца. Палі, якія падлягаюць апрацоўцы раньняй вясной таксама ня прыгодны для расьцілу. Расьціл павінен праводзіцца ўзімку з такім разьлікам, каб увесну траста трапіла на травяны пакроў, альбо на старое жніўё.

ТЭХНІКА РАСЬЦІЛУ.

Перад расьцілам салома павінна быць адсартавана на некалькі партый; па даўжыні, таўшчыні, колеру, кожная партыя адсартаванай саломы павінна быць разасласна асобна, ня зьмешваючы адну партыю трасты з другой. Спосаб-жа зімовага расьцілу павінен быць прыкладна такім-жа, як і ўвосень. Расьціл праводзіцца роўнымі радьмі каля 2 тон саломы на 1 га.

Калі калгас разасласьць саломы на мясцох, не закрытых ад ветру, дык неабходна арганізаваць ветра-абаронныя загароды, хоць-бы шляхам раскладкі лёгкіх жардзін па радкох саломы лёну і тым самым захаваць саломы ад зносу моцнымі вятрамі.

ЧАС СКАНЧЭНЬНЯ ЛЕЖКІ.

Лепшая якасьць валакна атрымліваецца пры зацягнутым таяньні сьнегу. Адліга і зацягная вясна пасягаюць вылежку. Звычайна пры спрыяючых умовах салома бывае зусім гатовай ў канцы красавіка, пачатку мая, але часамі пры цёплым вясенным надвор'і і частых адлігах яна можа быць гатовай і да выходу ўсяго сьнегу. Браць пробы неабходна як мага часьцей у канцы лежкі, не радзей як праз 2-3 дні, асабліва ўвесну, пры цёплым надвор'і з тым, каб траста не пераляжалася і не сапсавалася.

Для праверкі гатоўнасьці трасты ў зімовы расьціл калгас павінен вылучыць вопытнага калгасьніка, на якога трэба ўскласьці ўсю адказнасьць за якасьць правядзеньня зімовага расьцілу.

Як толькі траста вылежалася, валакно пачынае лёгка аддзяляцца ад драўніны, яна падымаецца са сьцелішча. Зборку трасты са сьцелішча можна праводзіць рукамі, крукамі, граблямі і г. д. Сабраная траста ставіцца тут-жа ў бабкі, конусы для прасушкі на ветры і сонцы.

Аграном Чэкмароў.

Па БССР

Добрусская папяровая фабрыка «Герой Працы» на 14-га лютага ізбыцны плян выканала на 54,4% 15 лютага фабрыка дае рэзкае зьніжэньне ў сэнсе выпрацоўкі. Дзённы прэсфіпляні выкананы на 5,2 проц. 16 лютага дзённы плян выкананы на 33 проц. 17 лютага на 43 проц. і 18 лютага на 63,2 проц.

За 15 дзён лютага лесацэх Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату выканаў плян на 94 проц. Пільня № 6 на 95,6 проц., пільня № 7—на 79,8 проц. Беладзерэўны цэх агульны плян выканаў на 86,6 проц. і экспартны плян на 98,9 проц., фанарны цэх агульны плян выканаў на 82,2 проц., экспартны плян на 86,5 проц. Цэх стандартных дамоў выканаў плян за гэты час на 95,3 проц.

Папяровая фабрыка «Спартак» з 11 на 15 лютага пяцідзённы плян выканала на 49,3 проц. За гэты час фабрыка дае 35,71 проц. прастою, галоўным чынам, з-за недахвату энэргіі з Белдрэса. За гэты час Белдрэс не дадаў 91,33 гадзіны энэргіі.

На Гомсельмашы ўпяршыню ў СССР зроблена канюшынасартыроўка. Гэтая машына зьяўляецца лепшай па якасьці, чымся прыязныя машыны з Германіі. Заключэньне і выгуд гаворыць: якасьць апошняга прадукту, які атрымліваецца ад сартыроўкі № 001 зусім раўнацэнна сакатар'ату, які атрымліваецца ад нямецкіх імпартных машын. Зараз у абарачным цэху Гомсельмашу знаходзіцца ізначэ 30 канюшынасартыровак, якія ў гэтым месяцы павінны быць адгружаны сацыялістычнай гаспадарцы СССР.

Да ўсіх фізкультурнікаў БССР, ЦСПСБ і ВСФК пры ЦВК БССР зьвярнуліся з адозвай, у якой у якасьці адной з баявых задач да пленуму ВСФКБ і ВСФК СССР паставілі падвоеньне радоў фізкультурнікаў Беларусі. «Па-бальшавіцку змагацца за 50 тысячную армію фізкультурнікаў Беларусі—справа чэсьці, справа доблесьці і геройства» кожнага работніка на фізкультурным фронце, кожнага фізкультурніка «масэбу». Па БССР абвешчана дэкада штурму фізкультурнай работы.

Да 14-й гадавіны Чырвонай армії заўком дрэваапрацоўчага камбінату ў Бабруйску перадае II-скаму страховаму пазыку гадзіны прамлянньня лепшых байцоў і камандзірскладу 1.000 руб. грашыма, адно месца на курорт і 4 месца ў дом адпачынку.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыяту Працы БССР

25 студзеня 1932 г. № 4 Гор. Менск

„Пра аплату працы вярбоўшчыкаў“

У мэтах стварэньня ўмоў для правільнай работы вярбовачнага апарату па арганізаваным наборы рабсілы, заахвочваньні вярбовачнага апарату за поўнае і якаснае і своечасовае выкананьне заданьняў па вярбоўцы рабсілы і ліквідацыі абязьлічкі ў гэтай справе і каб забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду пра паляпшэньне складу вярбоўшчыкаў—Народны Камісарыят Працы БССР ў адпаведнасьці з пастановай НКП СССР ад 8-I—1932 г., № 1, пастанаўляе перавесьці вярбовачны апарат усіх прадпрыемстваў і ўстаноў БССР на наступную прэміяльна-заахвочваючую сыстэму аплаты працы:

I. АСНОЎНЫ АКЛАД.

1. Аплата працы вярбоўшчыкаў, асноўнай работай якіх зьяўляецца вярбоўка рабсілы, робіцца па пасадных акладах, устаноўленых Наркампрацы БССР на 1932 год.

2. Калі да вярбоўкі прыцягваюцца іншыя работнікі, асноўнай работай якіх не зьяўляецца вярбоўка, дык за імі за ўвесь час вярбоўкі захоўваецца аклад зарплаты, які яны атрымоўваюць па асноўнай пасадзе.

Калі-ж аклад сталага вярбоўшчыка ў даным раёне вышэй аклада таго работніка, які часова вядзе вярбоўку, дык апошняму выплачваецца аклад вярбоўшчыка.

3. На працяту кожнага месяца вярбоўшчыку выплачваецца 80 проц. аклад.

Канчатковы разьлік вытвараецца па скончэньню трох месяцаў, а калі вярбоўка скончылася раней.—дык пасьля яе скончэньня.

II. НОРМА ВЯРБОЎКІ І ПРЭМІІ.

4. Норма вярбоўкі рабсілы, у залежнасьці ад умоў раёну, устанаўляецца гаспадарчым органам па ўзгадненьні з профсаюзам і зацьвярджаецца гарадзкім ці раённым інспэктарам працы.

Норма вярбоўкі паведамляецца вярбоўшчыкам перад пасылкай іх на работу.

5. Пры невыкананьні поўнай нормы вярбоўкі па прычынах, якія залежаць ад вярбоўшчыка, аплата робіцца згодна чынному законадаўству.

6. Калі вярбоўшчык выканаў ў тэрмін устаноўленую норму вярбоўкі, дык яму выплачваецца прэмія ў разьмеры 50 проц. яго месячнага аклада.

Калі тэрмін вярбоўкі складаў менш месяцаў, дык прэмія выплачваецца ў разьмеры 50 р. заработка за тэрмін, які вызначан быў для даннае вярбоўкі.

7. За датэрміновае выкананьне заданьняў вярбоўшчыку выплачваецца дадатковая прэмія ў разьмеры 25 проц. акладу за час з дня фактычнага скончэньня вярбоўкі да дню, вызначанага для выкананьня ўсяго заданьня.

ПРЫКЛАД: Вярбоўшчык з акладам у 150 р. атрымаў заданьне навербаваць 500 чалавек у 2 месяцы, а выканаў гэта заданьне ў адзін месяц. Вярбоўшчыку выплачваецца:

а) аклад за адзін месяц—150 руб.
б) прэмія за выкананьне нормы ў тэрмін (50 проц. месячн. акладу) . . . 75 руб.
в) Дадатковая прэмія за датэрміновае выкананьне нормы 25 проц. мес. акладу) . . . 37 р. 50 к.
УСЯГО . . . 262 р. 50 к.

8. Прэміі выплачваюцца за лік агульных фондаў, якія адпушчаны на вярбоўку.

9. Прэміі выплачваюцца кожныя 3 месяцы, а калі вярбоўка скончылася раней, дык пасьля скончэньня вярбоўкі.

III. КОНПЭНСАЦЫІ ЗВЯЗАНЫЯ З РАЗ'ЕЗДАМІ.

10. Вярбоўшчыкам, асноўная работа якіх зьяўляецца вярбоўка (арт. 1) выдаткі па праезду да месца вярбоўкі аплачваюцца па нормах, устаноўленых як камандыраваным.

У тых выпадках, калі гэтыя вярбоўшчыкі камандыруюцца за межы ўстаноўленага для іх раёну вярбоўкі, ім выплачваюцца, акрамя таго, сутачныя па згодзе бакоў, аднак, ня вышэй 1/60 акладу і ня ніжэй 2 р. 50 к. і кватэрныя ў разьмеры 2 р. у суткі.

11. Вярбоўшчыкам, асноўнай работай якіх вярбоўка не зьяўляецца (арт. 2) пры вытварэньні імі вярбоўкі ўне месца іх асноўнай работы, выплачваецца:

а) Выдаткі па праезду—па нормах устаноўленых для камандыровачных па згодзе бакоў;

б) сутачныя ў разьмеры—па згодзе бакоў,—аднак, ня вышэй 1/60 акладу і ня ніжэй 2 р. 50 кап.;

в) кватэрныя ў разьмеры 2 р. у суткі.

12. Устаноўлены гэтай пастановай парадак аплаты зьяўляецца абавязковым для ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў арганізаванага сэктару і яго парушэньне сьцягвае адказнасьць як за парушэньне дзяржаўнага нармаваньня заработнае платы.

Нам. Наркампрацы БССР Ф. Пушчын.

Нач. сэктару орг. і аздар. умоў працы БССР Іозэф.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 27-II — 32 г., а 10 гадзіне раніцы ў г. Жыткавічах (РКК) будзе працаваць выязная ПТ ЦКК па разглядзе партспраў наступных таварышоў:

1. Турэцкі С. (Жыткавічы).
2. Сацэвіч Мафодзі Рыгораў (Жыткавічы).
3. Галавач Сьцяпан Паўлаў (Жыткавічы).
4. Ермаловіч Уладзімір Мікалаеў (Жыткавічы).
5. Руды Янка Мікалаеў (Тураў).
6. Гелер Мотэль Беркаў (Тураў).
7. Гінэльман Б. К. (Тураў).
8. Казлоў Іван Савельяў (Тураў).

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Праезд за свой кошт.

Член ПК ЦКК КП(б)Б Біге.

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б прапануе упаўнаважаным ЦК, таварышам, камандыраваным у раёны цэнтральнымі ўстановамі па тых, ці іншых заданьнях, зараз-жа ўключыцца ў дапамогу раённым арганізацыям па стварэньні насенных фондаў калгасамі, кіруючыся ў гэтай рабоце пастановай ЦК УсеКП(б), СНК СССР, апублікаванай у газ. «Правда» ад 17-II 1932 г.

Загадчык Агіт. Мас. Аддзелам ЦК КП(б)Б Гаруновіч.

Нам. адказнага рэдактара Г. АДАМСОН.

Гукавое кіно тэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРЗА» Каса з 1 г дня — 21 і 22 лютага ГЕРОЙ МАРХОТЫ

Кіно «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» Каса ад 12 гадз — ХТО ВІНАВАТЫ

Кіно «ПРАЛЕТАРЫ» — З камэды ў адзін сэанс Лі ў даю, Чаплі ў тэатры і Ласо

ТРАКТАРАЦЭНТР БССР запрашае для работы ў МТС БУХГАЛЬТАРОЎ
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ
Жадаючыя паступіць на работу павінны падаць заявы ў Белтрактарацэнтр, аддзел кадраў,
Менск, Чырвонаармейская, Дом Калгасьніка
Белтрактарацэнтр

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР
даводзіць да ведама ўсіх гаспадарчых арганізацый БССР аб тым,
што ім, на выпадак ПАТРЭБЫ ШОФЭРАЎ,
неабходна зьвярнуцца ў Аўтадор
(МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 82)
і заключыць умову на падрыхтоўку шофэраў
ТЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ НЯ ЗРОБЯЦЬ ЗАЯВАК ДА 25-га ЛЮТАГА 1932 году,
СТРАЦЯЦЬ ПРАВА на прад'яўленьне прэтэнзіі ў забясьпечаньні іх ШОФЭРАМІ
Сэктар Працы і Кадраў ГДТ

Дом Пісьменьніка
22-га лютага г. г. а 7-й гадз. увечары працяг спэчак па дакладу т. Лынькова:
„Ліст т. Сталіна і задачы беларускай пралетарскай літаратуры“
Выступаюць т. т.: Лініаноўскі, Чорны, Галавач, Кучар, Аляхновіч, Шэнгель, Мікуліч, Лужанін, Куніцкі, Баранавых, Сла[illegible], Вярпікоўскі і інш.
Уваход вольны,
Бюро МенАПП

Дом Працасьветы
23-га лютага роўна а 7 гадз. увечары адбудзецца вечар асьветнікаў,
прысьвечаны сьвяткаваньню XIV гадавіны Чырвонай арміі
Вечар адбудзецца разам з падшэфнай вайсковай часткай.
Білеты атрымліваюць МК і прафупаўнаважаныя у Гаркоме саюзу працасьветы з 10 да 4 гадз. дню.

ЗЬБЕГ сабака (аўчарка)
шэра-цёмнага колеру на клічцы „Планет“
Ведаючага аб месцазнаходжаньні паведамць за ўзнагароду па адрасе—Менск, Батарэйная, 3-1, Камлякоў З.Е.
За ўтойваньне буду прасьледваць па закону.

ЗГУБЛЕНА вэле-абавязальства сэр. 4, № 105020, выд. ашчадкасай № 16, лічыць несапраўдным

ЗГУБЛЕНА дамавая кніга д. № 33-1 па Кваснатоінскай вул., Пяцьсьпенсай амбуляторыі, лічыць несапраўднай

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка заўкому № 2 саюзу прамкамжыл буданіцтва, лічыць несапраўднай

БЯРЭЗІНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ
паведамляе ўсе зацікаўленыя ўстановы і асобы якія мелі прэтэнзіі да былога Бярэзінскага Райспажыўтаварыства ў 1931 годзе
пав'нны прад'явіць свае прэтэнзіі ў двухтыднёвы тэрмін з дня апублікаваньня.
Пасьля гэтага ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Бярэзінскі Райспажыўсаюз

Беларуская Кантора Акц. Т-ва „Крэдыт-Бюро“
ЗАПРАШАЕ НА СТАЛУЮ РАБОТУ
ў якасьці актывізатараў (зборшчыкаў)
грамадзян, працаваўшых у даваенны час у Страхавым Таварыстве „Нью-Ёрк“, а таксама і з іншых страхавых таварыстваў.
УМОВЫ ПА ЗГОДЗЕ
З прапановамі зварочвацца ў Кантору „Крэдыт-Бюро“, якая знаходзіцца ў будынку Дзяржбанку, або ў Кантору Торгсіна да нам кір. т. Бельгерскага

ЗГУБЛЕНЫ патэнт на права язды і конскі білет, выд. раёзьніку тав. Мінковічу С. І., лічыць несапраўднымі

ЗГУБЛЕНЫ:

Вайсковы білет Анжэнкава Д. Е., выд. Хоцімскім РВК. Квіт. 1402-п.

Вайсковы білет Салдаценка Ф. Я., выд. Хоцімскім РВК. Квіт. 1402-п.

Вайсковы біл. № 17 Краўчанкі Д. Я., выд. Хоцімскім РВК. Квіт. 1402-п.

Вайсковы білет Міханьцава Т. С., выд. Баханаўскім сельсаветам. Квітанцыя 1402-п.

Вайсковы білет Коктова Я. І., Выд Баханаўскім сельсаветам. Квіт. 1402-п.

Вайсковы білет Маскалева В. Ф., выд. Хоцімскім РВК. Квіт. 1402-п.

Вайсковы білет Міхальцава Т. П., выд. Баханаўскім сельсаветм. Квітанцыя 1402-п.

Вайсковы білет Напрэенкава І. С., выд. Хоцімскім РВК. Квіт. 1402-п.

Вайсковая кніжка Прудзікава Г. С., выд. Горацкім ваенкомам у 1920 г. Квіт. 1403-п.

Квітанцыя мэтавага збору на 25 руб. Панамарава М. Р., за № 26664 ад 8-XII № 30 г. Квіт. 1403-п.

Вайсковы білет Хмуровіча М. Л., выд. Горацкім ваенкаматам. Кв. 1403-п.

Разводны білет Мардзелева А. І., выд. Горацкім гарсаветам 1929 г. Квіт. 1403-п.

Вайсковы білет за № 48 Майстрава П. Ф., выд. Шашоўскім ваенкаматам. Квіт. 1403-п.

Мэтрычная выпіска сына Іосіфа Ефімавіча Майціна Е. Б. радз. 1-I 1927 г. Квіт. 1403-п.

Пасьведчаньне на права пасіць ружа Шумячэра С. Г., выд. Аршанскім ДПУ № 70, студэнцкае пасьведчаньне № 88. Квіт. 1403-п.

Мэтрычная выпіска Шылава А. Е., выд. Матілеўскім ЗАГС-ам у 1926 г. Квіт 1403-п.

АДРАС РЭДАКЦЫІ і ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Пляц Волі, 17. Тэлефоны: Адказны рэдактар—7-69, адказны сакратар 4-78, сэктары 615, выпускаючы—12 65 (два званкі), выдавецтва—2-44.
Умовы падпіскі: на 1 год—12 р., 6 месяцаў—6 руб., 3 м-цы—3 руб., 1 месяц—1 руб. Падпіска прымаецца выключна на пошце

Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—53.

Друкарня імя Сталіна.